Агнешка Голанд ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Кастусь Кіслы ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 04 (2698) Год LIII | Беласток, 27 студзеня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Падзенне Міколы Яноўскага

Мікола Яноўскі (ПСЛ), які прызнаецца дла сваіх беларускіх каранёў, загінуў на полі палітычнага бою і ўласных амбіцый. Не ўвайшоў ён паўторна ў склад новай управы Падляшскага ваяводства. Быў яе членам (а мог быць нават і віцэ-маршалкам), калі дагэтуль кіравала кааліцыя ПСЛ-ПіС. Цяпер людоўцы рашылі звязацца з Грамадзянскай платформай. Узнікла новая ўправа. Міколу Яноўскаму, родам з Пераходаў пад Гайнаўкай, выбранаму ў сеймік з гайнаўскай акругі, месца ў ёй не хапіла.

Перадпаўдзённы час. У закавулках сеймікавых кулуараў з членамі клуба ГП дыскутуюць дэпутат Роберт Тышкевіч, лідэр Грамадзянскай платформы на Падляшшы, і дэпутат Ян Камінскі, які ачольвае падляшскіх людоўцаў. Сесія сеймікa, у час якой наступілі змены ў ваяводскіх уладах, мела пачацца якраз ад персанальных змен, ад абмеркавання прапаноў па адкліканню ПіСаўскага маршалка Дарыюша Пянткоўскага (па прапанове апазіцыйных радных) ды члена ўправы — якраз Міколы Яноўскага (па прапанове маршалка). Аднак шэф клуба ГП Яраслаў Дважанскі папрасіў змяніць павестку дня і гэты пункт дыскусіі і адпаведныя галасаванні перанесці з перадабедзенных гадзін амаль на канец сесіі. Так і адбылося. ГП ды ПСЛ і ЛіД прапанову падтрымалі. Ужо тады трох радных з кіруючага дагэтуль ПіС галасавала іначай, чым вырашыў іх клуб. На 29 (з 30; адзін незалежны радны быў непрысутны), 19 самаўрадаўцаў падтрымалі прапанову, дзевяцёх было супраць, а адзін устрымаўся ад голасу. Раскольнікамі з партыі Яраслава Качынскага аказаліся былы член управы Беластока Багуслаў Дэмбскі, былы працаўнік дэпутацкага бюро Рамана Чэпэ Яцак Лапінскі і былы прэзідэнт горада Беластока Лех Руткоўскі.

Пасля поўдня. Перад роспускам старой і выбарам новай управы папрасілі мы Дарыюша Пянткоўскага, каб нам пералічыў, чаму ён хоча адклікаць Міколу Яноўскага, якому пару тыдняў таму прапанаваў пасаду віцэ-маршалка (а не толькі члена ўправы, пасаду якога займаў раней):

— Супрацоўніцтва ў кожнай групе абапіраецца на супольны давер. Спадар Яноўскі вынес прапанову аб адмене цяперашняй управы ваяводства і гэтым самым выказаў вотум недаверу да астатніх калег. З таго вось той недахоп даверу. Здавалася быць лагічным, што пасля такога акту спадар Яноўскі сам адрачэцца ад далейшай працы ва ўправе, не бачыўшы магчымасці супрацоўніцтва з рэштай калег [выключна з ПіС — М. Х.]. Паколькі не хапіла яму адвагі або вырашылі аб гэтым іншыя прычыны, я рашыў выступіць з адпаведнай прапановай, раней пазбаўляючы пана Яноўскага большасці кампетэнцый. На гэты момант або я, і што за гэтым ідзе цэлая ўправа павінна быць адкліканай, або пан Яноўскі.

Калі спыталіся мы аб ацэнку паводзін усяго клуба ПСЛ, сказаў ён нам адназначна:

— Гэта палітычная несумленнасць.

Мікола Яноўскі ў размове з „Нівай" паставіўся да папрокаў, сфармуляваных у яго адрас маршалкам Пянткоўскім:

— Я падпісаўся пад прапановай аб роспуску ўправы паколькі лічу, што кааліцыя ў нашым самаўрадзе мусіць перакладвацца на ўрадавую кааліцыю, каб вырваць як мага больш сродкаў. Кааліцыя ПСЛ з ПіС не дае ўжо эфектаў. Відаць гэта па цэнтральных скарачэннях бюджэту, хоць бы на універсітэцкі кампус ці оперу ў Беластоку. Гэта натуральна, каб наша партыя была ў кааліцыі з ГП.

Адвячорак. У сеймікавых кулуарах былы маршалак ваяводства ад СЛД, цяпер старшыня клуба ЛіД Януш Кшыжэўскі прызнаўся „Ніве":

— Прапанова аб адкліканні пана Яноўскага з'яўляецца паслядоўнасцю пазіцыі гэтага клуба ў справе адклікання ўсёй цяперашняй управы. Хачу тут адзначыць, што я раней не галасаваў за выбарам ва ўправу пана Яноўскага. Падпісанне ім самім прапановы аб адмене ўласнай управы лічу сама менш гратэскным.

І дадаў, спасылаючыся — на тады яшчэ — магчымую вольту ПСЛ і яе кааліцыю з ГП:

— ПСЛ за гэта яшчэ расплаціцца.

Мікола Яноўскі:

— Найгоршым было б, калі б радныя не адклікалі ні мяне, ні маршалка Пянткоўскага.

Ранні вечар. Радныя 19 галасамі за, дзевяццю супраць і адным няважным голасам адклікалі Дарыюша Пянткоўскага. Гэтым самым упала ўся ўправа з Міколам Яноўскім. З трыбуны ўступаючы маршалак звярнуўся да трох радных свайго клуба:

— Здраднікам жадаю, каб ім не шанцавала.

Радныя неадкладна прызначылі на пасаду новага маршалка, настаўніка фізкультуры адной з беластоцкіх пачатковых школ і пазнейшага яе дырэктара, а ў апошні час кіраўніка Гарадскога асяродка спорту і адпачынку ў Беластоку ды старшыню гарадскіх структур Грамадзянскай платформы Яраслава Дважанскага. Пасля выбару сказаў ён:

— Спадзяюся, што пэўныя падзелы, якія стварыліся ў апошні час у сеймікі, удасца мне засыпаць.

Мікола Яноўскі сказаў „Ніве":

— Каб стаць на пасаду маршалка, у мяне замалы вопыт. Можа, не прыйшоў яшчэ мой час. Была дыскусія: маршалак або ад ГП, або ад ПСЛ. Калі б ад ПСЛ, быў бы ім я. Каб быць членам ваяводскай управы, трэба мець пятую частку галасоў. Калі б новы маршалак падаў маю кандыдатуру на члена ўправы ці віцэ-маршалка, дык прыму, бо гэта я вінаваты перад сваімі выбаршчыкамі.

Новаабраны маршалак вылучыў кандыдатуры Багуслава Дэмбскага — „здрадніка" з ПіС і Ігнацы Ясяноўскага з ПСЛ на віцэ-маршалкаў ды Яцка Пярунка ад ГП і Мечыслава Башко ад ПСЛ на членаў управы. У найвышэйшых самаўрадавых ваяводскіх уладах Падляшша месца для Міколы Яноўскага не знайшлося.

Мікола Яноўскі хвіліну перад выбарам новага падляшскага маршалка на фоне будынка маршалкоўскай управы ў Беластоку

Пад знакам Марцінкевіча і Беласточчыны ☞ 5

Аляксей МАРОЗ

У гэтым годзе ў Беларускай алімпіядзе ўпершыню ўдзельнічалі ліцэісты з Беластока. Сардэчна прывітаў іх прафесар Аляксандр Баршчэўскі, які старшынюе Галоўнаму камітэту алімпіяды. Новых сяброў цёпла ўспрынялі таксама бельскія і гайнаўскія белліцэісты...

РАЗАМ З „НІВАЙ" — ДОМА, НА ПРАЦЫ, ВА ЎСТАНОВАХ

Вялікая прамоцыя для падпісчыкаў (прэнумератараў) „Нівы"!

Прыватныя асобы, фірмы, самаўрадавыя і дзяржаўныя ўстановы! Калі Вы яшчэ не зрабілі падпіскі на наш тыднёвік на 2008 год, дык спяшайцеся. Калі да канца студзеня Вы на пошце, у кіёсках „Руху" і „Кальпортэра" або ў рэдакцыі падпішацеся на „Ніву" да канца 2008 г. і прынясеце непасрэдна або дашлеце па пошце распіску аб падпісцы да 15 лютага 2008 г. у сакратарыят газеты, Вас чакаюць узнагароды!!!

Кожны адзін падпісчык (прэнумератар) атрымае бясплатна апошнюю, выдадзеную нашай рэдакцыяй кнігу „Час трывогі і надзеі. Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў 1944–1956 гадах". Кніга з'яўляецца запісам успамінаў нашых дзядоў і бацькоў пра іх цяжкі пасляваенны лёс. Шмат увагі і дакументаў адводзіцца спаленым вёскам і загінуўшым там людзям. Кніжка мае перш за ўсё трапіць толькі да падпісчыкаў.

Калі Вы, Ваша фірма ці ўстанова падпішацеся на 2 экземпляры „Нівы", тады апрача кніжкі атрымаеце яшчэ бясплатна кампакт-дыск і касету з цікавай беларускай музыкай калектываў Беласточчыны.

Калі ў Вас будзе жаданне падпісацца на 3 і больш экземпляраў „Нівы" да канца 2008 г., апрача вышэйпералічаных падарункаў Вы атрымаеце падборку ўжо недаступных у распаўсюдзе рэдакцыйных выданняў ды іншыя неспадзяванкі.

МНОГА КОЖНЫ З НАС ГУБЛЯЕ, КАЛІ „НІВЫ" НЕ ЧЫТАЕ.

9 770546 196000

Заканчэнне НЭПу

Разганяць мітынгі палітычнай апазіцыі на Беларусі справа няхітрая, няцяжкая і даўно адладжаная. На тое гадамі працаваў сілавы апарат краіны. І АМАПаўцы на палітзанятках даведваюцца пра нядобрыя намеры апазіцыянераў, і народ праз радыё, тэлебачанне ды дзяржаўную прэсу таксама набывае падобную інфармацыю. А там гаворыцца, што апазіцыя, гэта людзі якія рвуцца да ўлады, а самі няздольныя зрабіць анічога. Таму, калі яны прыйдуць да тае ўлады, не выключаны распродаж маёмасці, эканамічны спад, голад, а можа нават і вайна. Дайшло да таго, што ажно вышэйшы чын КГБ, выступаючы па тэлебачанні на святкаванні „дня чэкіста", адкрыта заявіў, што ён ведае не толькі колькасць апазіцыянераў, але нават ведае кожнага з іх асабіста. Такім чынам адкрыта прадэманстраваў чым займаюцца на Беларусі спецслужбы, каму яны служаць, і як выконваюць дадзеную народу прысягу. Таму самаму народу, у склад якога па праву дадзенаму канстытуцыяй уваходзіць і апазіцыя.

Іншая справа прадпрымальнікі. Тут і тыя АМАПаўцы, і супрацоўнікі спецслужбаў ды і грамадства ў цэлым не навучаныя яшчэ іх не цярпець. Тым больш, што ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі сцвярджаецца, што ўлада іх любіць бязмерна і робіць усё магчымае, каб аблегчыць ім жыццё ды працу. Растлумачыць зараз, чаму трэба разганяць прадпрымальніцкі мітынг вельмі цяжка, бо спецслужбы і бізнес неразрыўныя паміж сабой. А сярод прадпрымальнікаў ёсць і таты і мамы міліцыянтаў, што стаяць са шчытамі ды дубінкамі на плошчы. Тут справа нашмат больш далікатная, чым з палітычнай апазіцыяй. Хіба таму большасць затрыманых і асуджаных за несанкцыянаваную акцыю ў Мінску да прадпрымальніцтва маюць адносіны толькі з боку абароны справядлівасці, правоў чалавека і свабоднага бізнесу. Саміх жа гандляроў браць загаду не было.

Ды і навошта. Разлік улад вельмі просты. Пастаяць, пабубняць, палічаць страты ды пойдуць перарэгістроўвацца на ПУПаў. Максімум месяц паабураюцца ды супакояцца. Трэба ж карміць дзяцей. А на мітынгах шмат не заробіш.

Хутчэй за ўсё так яно і будзе, бо для сапраўднага цвёрдага і доўгатэрміновага змагання за свае правы выстаўляць эканамічныя патрабаванні мала. Тут патрэбныя іншае мысленне, і іншыя мэты. І айчынная гісторыя таму пацвярджэнне. Раскулачванне ў нас ужо было. І ўмовы ставіліся падобныя. Хочаш быць самастойным гаспадаром, то маеш права наймаць работнікаў толькі з ліку бліжэйшых сваякоў. Ды ў дадатак падаткі плаціць трэба было большыя, чым тэарэтычна можна зарабіць. У адваротным выпадку ты кулак. А з кулаком размова кароткая.

Дакладна такія ж умовы сёння пастаўлены індывідуальным прадпрымальнікам. Не больш трох наёмных работнікаў і толькі з ліку бліжэйшых сваякоў. А спіс тых бліжэйшых вельмі абмежаваны: тата, мама, брат, сястра, дзеці ды жонка. Як выкручвацца тым, у каго яны жывуць далёка, ці ўвогуле няма, ці, прыкладам тым, у каго жонка ляжыць у радзільным доме і толькі збіраецца падарыць прадпрымальніку бліжэйшага сваяка, у інструкцыях не гаворыцца.

Ды нават у каго яны ёсць, тыя бліжэйшыя, то чаму яны не маюць права абраць іншы працоўны шлях, а не толькі гандляваць у татавым шапіку. А таму выйсця няма іншага як зрабіць сына прадаўцом, бо самому па тавар трэба ехаць, дакументацыю весці, падаткі выплачваць. А хто ж гандляваць будзе? Таму і жартуюць беларускія бізнесоўцы, што сын міністра міністрам можа стаць, сын міліцыянта можа стаць міліцыянтам таксама. А вось сын індывідуальнага прадпрымальніка можа быць толькі прадаўцом. У адваротным выпадку яго тата прадпрымальнікам быць не зможа.

Праўда, ёсць выйсце — стаць прыватным унітарным прадпрыемствам, ці як у народзе скарочана называецца ПУПам, да чаго ўласна і схіляе ўлада гандляроў. А ПУП ужо нешта блізкае па сугуччу да „кулака". Глядзіш і „распупачванне" неўзабаве надыдзе. Гісторыя, як кажуць, ідзе на спіралі і паўтараецца ў выглядзе фарса. Таму, зазірнуўшы ў гістарычнае мінулае і параўноўваючы яго з сённяшнім днём, сама па сабе напрошваецца аналогія, што перыяд НЭПу ўжо закончыўся. І НЭПманы больш не патрэбныя для ўлады. Прыйшоў іншы час. Час усеагульнай калектывізацыі з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі.

Віктар САЗОНАЎ

Пра стары, добры свет

Польскі лаўрэат Нобелеўскай прэміі Чэслаў Мілаш сказаў калісьці, што ніколі не быў у змозе адобрыць погляды амерыканскіх кансерватараў, паколькі асацыяваліся яны яму з тупасцю, адсталасцю і прымітывізмам. Мілаш меркаваў, што гэта мабыць таму, што эліты ЗША — зычлівыя для левых поглядаў, падатлівыя на ўплывы ідэй, якія ў іншым месцы лічацца крайне левымі. Разнаколерныя сацыялісты былі проста больш інтэлігентнымі. Мабыць, Мілаш ведаў што казаў, паколькі шмат гадоў пражыў ён у эміграцыі ў доме з відам на бухту Сан-Францыска.

Можа, аднак, Мілаш лічыў кансерватыўнай спадычнай погляды адно кансерватыўных радыкалаў, заалагічных антыкамуністаў, якія лічаць няраз камуністам не толькі англійскую каралеву, але і каталіцкага папу. Для крайніх лібералаў, рамантыкаў свабоднага рынку, свабодная эканоміка становіцца мэтай самой у сабе, а высокі гаспадарчы рост — найвышэйшым ідэалам. Таксама і пад польскім небам хапае тых, якіх перастала турбаваць агульнае дабро, супольнае, лепшае жыццё мільёнаў грамадзян, а паднебнай каштоўнасцю стала чысціня прынцыпаў свабоднай эканомікі. Радыкалы свабоднага рынку спасылаюцца прытым на погляды Адама Сміта, мысляра XVIII стагоддзя, як свайго настаўніка, іхняга гуру. Паяўляецца, аднак, сумненне, ці тыя радыкалы асноўны твор іх майстра прачыталі!

Гісторык ідэі Анджэй Валіцкі з'яўляецца знакамітым знаўцам расійскай праблематыкі, знаўцам расійскай культуры, палякам, які не адчувае антырасійскай фобіі, а тая фобія часта набывае выгляд і антыбеларускасці, і антыўкраінскасці, і ўвогуле антыправаслаўя. (Можа, якраз добрае азнаямленне са справай складае ахову ад спусташаючай розумы нянавісці, ахвоты выклікання вайны на смерць і жыццё). Валіцкі ў сваёй апошняй кнізе „Аб інтэлігенцыі, лібералізмах і Расіі" акцэнтаваў здраду прызвання часткі польскай інтэлігенцыі, якая на плячах страйкуючых рабочых узабралася да ўлады, пасля чаго, пасля адраджэння капіталізму разам з яго грамадскімі напругамі, беспрацоўем і недастаткам у вялікіх колах грамадства, быццам бы забылася на традыцыю служэння пакрыўджаным, захлёбваючыся лозунгамі свабоднага рынку ў іх радыкальным выглядзе. Гэта светлая традыцыя інтэлігенцыі як грамадскай праслойкі, якой задачы служэння народу першы раз аб'явіліся ў XIX ст. якраз на землях даўняй Польшчы, а распаўсюдзіліся ў царскай Расіі.

Здрада часткі эліт заключалася б у спробе пранікнуць на салоны ўлады, а тая ўлада простых людзей, можа, ненайразумнейшых, неадукаваных, слабых і бедных ды пакрыўджаных у час глабальных перабудоў — мае ў пагардзе, глядзіць на іх звысоку, паколькі тыя людзі самі адказваюць за сваё становішча, а ў сувязі з гэтым не заслугоўваюць на злітаванне, на міласэрнасць. Гэта якраз разуменне свабоды ў духу крайняга лібералізму, які ўяўляе рэчаіснасць як поле бою, на якім слабейшыя загінуць, паколькі такія жалезныя правілы гісторыі. Прапаведваюцца прытым лозунгі моцнай, спраўнай дзяржавы, хуткага эканамічнага росту, беспамылковай, моцнай улады.

Такой уяве свабоды супрацьпастаўляецца тая высмейваная, быццам бы вартая пагарды, быццам бы старэючая Еўропа, якая сваёй галоўнай мэтай ставіць якраз абарону пакрыўджаных, дбае аб правы чалавека, правы на свабоду выказвання, гуртавання, дэмакратычнага выбару; незалежна ад таго, што выбары часта з'яўляюцца тэатрам фальшу і нікчэмнасці, але, як дагэтуль, нічога лепшага пад небам не выдумалі. Гэтая Еўропа не абяцае цудаў, яна недасканалая, паддаецца пераменам, якія невядома куды вядуць. Затое цуды абяцаюць тыя радыкалы, няўстойлівыя, неспакойныя паўстанцы, ваяры заадано як з правага боку палітычнай сцэны ды, што парадаксальна, так і з левага.

Аб гэтым жыхары краін Усходняй Еўропы ведаюць найлепш, паколькі рэвалюцыя адціснулася ім на жывой скуры, аж да крыві.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Пад дыктоўку?

На апошняй сесіі Падляшскага сеймі-ка, у час якой Грамадзянская платформа замяніла Права і справядлівасць у ваяводскай управе і ў першы дзень бюджэтнага пленарнага пасяджэння Сената падышоў да мяне Збігнеў Нікітаровіч, старшыня клуба радных ГП у беластоцкай Гарадской радзе, дырэктар бюро дэпутата і шэфа падляшскіх структур ГП Роберта Тышкевіча. Нервова спытаўся ў мяне, спасылаючыся на нядаўнюю сеймавую бюджэтную дэбату:

— Гэта праўда, што ў Сейме мы не далі грошай на рэнавацыю манастыра ў Супраслі?!

— Наколькі ведаю, гэта праўда.

Дзве гадзіны пазней у ваколіцы сеймікавых абрад паявіўся сам дэпутат Тышкевіч. У кулуарах мы выпадкам трапілі адзін на аднаго.

— Нашы сенатары прагаласуюць папраўку і на далейшую адбудову манастыра ў Супраслі будзе сёлета паўтара мільёна злотых, — кінуў ён з задавальненнем.

Назаўтра пасля таго... поспеху ГП аж гудзела ва ўсіх беластоцкіх медыях. Адна з вядучых газет інфармавала: „Як сказаў нам сенатар Казімеж Клейна з ГП, за было 60 галасоў, супраць каля 30. Апрача сенатараў Платформы гэтую справу падтрымаў адзіны незалежны Владзімеж Цімашэвіч". У падобным тоне выказвалася большасць іншых лакальных СМІ і іх размоўцы. Адзначалася прытым у гэтым пытанні непрыязнасць ПіС і ласкаваць ГП. З пачуцця журналісцкай сумленнасці рашыў я праверыць ход сенацкага галасавання над гэтай папраўкай. І што аказалася. Вось на 39 сенатараў ПіС — 13 стрымаліся ад голасу, а чатырох былі за. На ўспомненых сенатарам Клейнам 60 прадстаўнікоў Вышэйшай палаты парламента, з ГП пяцёх не галасавала. Адзін стрымаўся ад голасу, адзін быў супраць — Анджэй Аўчарэк. Я спытаўся ў яго, чаму так прагаласаваў:

— Гэта з-за памылкі. У час галасавання маю ўвагу адвярнуў калега, які да мяне гаварыў.

З ПіС „за" паднялі рукі і націснулі кнопку: Пётр Анджаеўскі, віцэ-маршалак Сената Збігнеў Рамашэўскі, Багдан Пашкоўскі (папярэдні падляшскі ваявода) і выдатны навуковец Казімеж Вятр. З трох падляшскіх сенатараў супраць быў былы падляшскі ваявода з ПіС, Ян Дабжынскі.

Я папрасіў у сенатара Пашкоўскага пракаментаваць сваё галасаванне:

— У нашым клубе не было дысцыпліны ў гэтай справе. Калі была такая магчымасць у бюджэце дзяржавы, каб прафінансаваць гэтую інвестыцыю, дык чаму ж гэтага не зрабіць. У кляштара ў Супраслі аграмаднае культуратворчае значэнне. Яўнай няпраўдай з'яўляецца намёк, што ў прынцыпе ПіС быў супраць гэтай папраўкі. Можа, такое сцвярджэнне служыць лакальным гульням ГП? Можа, ГП такім спосабам хоча даказаць сваю адкрытасць?

Генеральна, за папраўкай галасавала 59 сенатараў, супраць было 21, устрымалася ад голасу 15, а 5 было непрысутных. Гісторыю галасавання пакідаю без каментарыяў.

І яшчэ. Тыдзень да адклікання ПіСаўскай управы, вырашыла яна аб назначэнні датацый у галіне „рэалізацыі мерапрыемстваў высокага мастацкага рангу, якія маюць служыць пабуджанню і заспакаенню культурных патрэб жыхароў". На канкрэтна беларускія, праваслаўныя праекты, як я вылічыў, будзе перададзеных каля 150 тысяч злотых, з чаго найбольш атрымалі абодва фестывалі царкоўнай музыкі (па 30 тысяч) і Звяз беларускай моладзі на стварэнне першага адрэзка Падляшскага культурнага шляху: „Драўляныя паселішчы — малы вялікі свет" (30 тыс. зл.). Таксама не абмінута Таварыства беларускай культуры (Фестываль „Беларуская песня" — 10 тыс. зл., Свята беларускай культуры — 4 тыс. зл.). На больш за 80 мерапрыемстваў былая ўжо ўправа рашыла фінансава падтрымаць 19 беларускіх, праваслаўных.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Мала я ведаю беларускую рэальнасць

Размова з Агнешкай Голанд, рэжысёркай, сцэнарысткай, амбасадарам Еўрапейскага міжкультурнага дыялога (прадстаўнік Польшчы ў еўрапейскім маштабе).

„Ніва": — ***Дзе, на Вашу думку, канчаецца Еўропа: на Бугу, Свіслачы, ці, можа на Волзе?***

Агнешка Голанд: — Некаторыя лічаць, што на Вісле. Для мяне ўяўленне Еўропы нязменнае і плаўнае, калі браць пад увагу грамадскія, культурныя, рэлігійныя, геаграфічныя крытэрыі. Пагранічча тут самыя цікавыя, бо безупынна перасоўваюцца. Паводле мяне, Расія гэта Еўропа, хоць большая частка яе ляжыць у Азіі. Незалежна ад таго, што палітычна, ментальна, ідэалагічна яна крыху некампатыбільная з уяўленнем Еўропы, якую мы звыкліся прымяняць, і якая штораз часцей атаясамліваецца з уяўленнем Еўрасаюза і яго спадарожнікаў. Для мяне праблема, ці Расію, Турцыю або Ізраіль лічыць Еўропай. Заціранне, аднак, межаў пагражае тым, што сатрэцца тоеснасць і я ў змозе зразумець, чаму таго якраз баяцца кансерватары. Хацелі б яны яснага тоеснага вызначэння ў глабалізаваным свеце. З аднаго боку націск глабалізацыі ўплывае на тое, што ўсё становіцца аднолькавым, а з другога боку вызваляецца ўсё мацнейшая патрэба названня ясных межаў тоеснасці. У мяне няма яснага погляду на справу. Час ад часу мне здаецца, што Еўропа канчаецца дзесьці на Сібіры, а часам, што дзесьці на французска-нямецкай мяжы.

— ***Калі б прымяніць назву аднаго з Вашых майстроў, Мілана Кундэры, ці маецца штосьці такое як Цэнтральна-Усходняя Еўропа?***

— ... Кундэра гаварыў аб Еўропе цэнтра, адменнай ад Усходняй Еўропы, якой не любіў. Гэта была ў сапраўднасці палітычная катэгорыя. Справа ў тым, каб адрэзаць тыя краіны, якія пасля II сусветнай вайны былі захоплены, здушаны савецкім рэжымам. Адрэзаць ад гэтага славянскага ўсходу, увесці ў той аўстравенгерскі, з літаратурай яго ўзорных пісьменнікаў, якія жылі ў нямецкамоўным абшары Еўропы: Музіля, Геса, Кафкі і іншых. Той абшар быў для Кундэры тым ядром, якраз — сярэдзінай, цэнтрам Еўропы.

— ***А ці тыя падзелы на Усходнюю і Заходнюю Еўропу, Цэнтральна-Усходнюю не залежаць ад адносін да Расіі? Тык прынамсі ў размове з нашым тыднёвікам сцвердзіла прафесар Марыя Янён.***

— У вялікай ступені — так, асабліва ў эстэтычным і культурным плане. Калі вы паходзіце па падземным пераходзе пад варшаўскім Галоўным вакзалам і пасля трапіце ў Маскву, то там убачыце ідэнтычныя сітуацыі, такія эстэтычна-бізнесава-эканамічна-архітэктурныя. Тыя буды, банкі... той усход. Штосьці такое цяжка сабе ўявіць на захадзе Еўропы. Можа, на ўскраінах гарадоў, але не ў іх цэнтрах. Тых вонкавых знакаў тае ўсходнясці вельмі шмат, асабліва ў былым расійскім заборы. Ды і не толькі. Значыць, незалежна ад таго, ці любім мы Расію, ці не, існуе з ёю нейкая эстэтычна-культурная сувязь, якая вызначае такі падзел.

— ***Як перамагчы боязь перад маніфеставаннем бунту? Я думаю пра страх сучасных беларусаў, а прыгадваюцца мне пазіцыі герояў Вашай фільмавай «Гарачкі» з 1980 года.***

— Сказаўшы шчыра, я не ведаю, ці на гэта існуюць нейкія метады. У пэўны момант наступае крытычны пункт і ўсё мяняецца. Ніхто з разумных людзей не ўмее таго ні прадбачыць так да канца, ні падрыхтаваць...

— ***А ці можна выклікаць той крытычны пункт?***

— Напэўна трэба ўздзейнічаць на свядомасць зняволення. Без гэтага цяжка, каб стварылася штосьці ясна выражанае. У людзях дзесьці адкладваюцца ўсе такія дзеянні, якія рабіліся ў Польшчы ці якія рабіла ў Чэхіі «Карта», значыць, адукаванне людзей усімі магчымымі сродкамі (і шляхам літаратуры, і мастацтва, і палітычных арганізацый, і маніфестацый, і адзінкавых актаў адвагі), каб грамадства ўсведамляла сабе, што зняволенне з'яўляецца пачварным гвалтам на паўнаце натуры чалавека. Ніхто не выдумаў чагосьці лепшага. Так дзейнічалі нават бальшавікі.

— ***Колькі пакаленняў трэба на гэтыя дзеянні, на выспельванне таго працэсу ўсведамлення стану зняволення?***

— З гэтым бывае па-рознаму, залежыць, дзе гэта адбываецца, залежыць ад базы...

— ***... У гэтай Усходняй Еўропе, Цэнтральна-Усходняй?***

— Таксама вельмі па-рознаму. Палякі, напрыклад, мелі нядрэнную трэніроўку ў руху супраціўлення. Усё XIX стагоддзе гэта спробы супраціўлення. Палякам менавіта было лягчэй, чым іншым, хоць бы, напрыклад, венграм, балгарам ці чэхам, не гаварыўшы ўжо аб славаках. Няма на гэта адназначных рэцэпт. Гэтага нельга прадбачыць да канца. Усе палітолагі аказаліся бездапаможнымі наконт аналізу перспектывы камунізму і працягу СССР. Лічылі, што Савецкі Саюз калісьці праміне як усе імперыі, але адбудзецца гэта не пры нашым жыцці. Тым часам расійская сістэма рухнула з дня ў дзень. Ніхто гэтага не прадбачыў. Памятаю, як Салжаніцын сказаў у адным інтэрв'ю на пачатку васьмідзесятых, што вернецца ў свабодную Расію. Тады палічылі яго вар'ятам, заклінальнікам рэчаіснасці. Аказалася, што ён меў рацыю. Можа, меў такое ўяўленне, але ніхто ў яе не верыў. Тое ўсведамленне зняволення можа працягвацца пакаленні, два, пяць; а можа тры гады. Я мала ведаю беларускую рэальнасць, ды думаю, што націскі з двух бакоў: з захаду праз Польшчу і праз Расію падмацоўваюць напругу ў Беларусі і гэтыя змены могуць наступіць вельмі хутка. У беларусаў няма свабодніцкіх навыкаў, такой свядомасці коштаў і прыбыткаў ад свабоды.

— ***У сувязі з гэтым скажыце, калі ласка, як грамадства можа выбрацца з закаранелай залежнасці ад улады савецкага тыпу?***

— Няма, як я ўжо сказала, іншага шляху, як адукацыя, прабуджанне ўсведамлення разнароднасці грамадскага, людскога, экзістэнцыяльнага існавання. Такія грамадствы перакананы, што няма ніякай альтэрнатывы для іх спосабу жыцця, баяцца выйсці з турмы, бо ў гэтай турэмнай камеры прыемна, свойска. Памятаю, як хтосьці параўноўваў краіны савецкага лагера да заапарка. Звяры там не маюць свабоды, але даюць ім есці, яны ў клетках, у якіх бяспечная прастора, не пагражае ім атака драпежнікаў. Затое ў джунглях, дзе яны на свабодзе, чакае іх шэраг небяспек; калі самі не здабудуць ежы, дык ніхто ім яе не дасць. Гэтая метафара можа крыху прасцяцкая, але паказвае добрыя і дрэнныя рысы адной і другой сістэмы. У гэтых грамадствах існуе патрэба мець бацьку; уладу, якая нясе адказнасць і гарантуе прынамсі мінімум бяспекі. Гэта можа быць прывабным пэўнаму тыпу людзей, выхаваных у «заапарку». Відаць гэта было ў Польшчы пасля трансфармацыі, калі агромная маса людзей аказалася бездапаможнай пры змене прынцыпаў гульні, дзе, калі мусілі ўзяць адказнасць за свой лёс, які павінен быць годным і хоць у меру матэрыяльна забяспечаным. Я ўпэўнена ў тым, што ў большасці посткамуністычных краін гэтыя ўласныя кошты страшэнныя для вялікіх груп людзей. На гэтым пагульваюць аўтарытарна-папулісцкія палітыкі, такія, як у Беларусі Лукашэнка. Так, дарэчы, ёсць усюды. Тыя палітыкі не выдумляюць праблем, але звяртаюцца да людзей, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі тых немагчымасцей і боязей. Можна паставіць пытанне да якой ступені можна падвяргацца шантажу гэтых боязей. У дзевяностыя гады ў Польшчы аказалася, што іх ігнараванне вядзе да свайго роду папулісцкай рэвалюцыі, у час якой уладу пераняла кансерватыўная партыя з папулісцкімі рысамі. Не маю рэцэпта, праграмы, як заспакоіць адных і другіх, значыць, давесці да ўзнікнення як найбольш канкурэнтнага рынку, свабоднага таксама ў філасофскім плане пры адначасовых патэрналістычных формах грамадскай арганізацыі, каб тым больш бездапаможным гарантаваць мінімум бяспекі. Толькі ці той мінімум задавальняльны? Гэта меншая праблема ў сітуацыі эгалітарызму, калі ўсе маюць мала. А калі справа ў здабыцці сваёй прасторы свабоды, дык самая прыгожая стадыя тады, калі тое змаганне адбываецца ў катэгорыях ідэі. Усе, хто ў цяперашніх посткамуністычных краінах прымаў удзел у руху супраціўлення, той час, той шлях да перамогі ўспамінаюць як той, што прынёс ім маральнае, індывідуальнае задавальненне. Не падказваю тут, каб беларусы бязмежна працягвалі гэты этап, але трэба разумець, што ў ніякім ладзе няма раю на зямлі.

— ***Успамінаеце аб неабходнасці адукацыі свядомасці грамадстваў рэжымнай сістэмы. Ну добра, ды як будаваць яе, калі так, як у сітуацыі Беларусі, у выніку ўзвядзення новай, у гэты раз шэнгенскай заслоны, яна вельмі абмежаваная?***

— Трэба ў гэтай сітуацыі стварыць лобі, націскаць на палітыкаў, якім інвеставанне ў беларускую справу, відаць, не нясе палітычнай выгады. Калі ўжо штосьці ў гэтым плане «аплачваецца», дык абарона палякаў у Беларусі. Для іх, польскіх палітыкаў, гэта медыйна карыснае. Сама ў сабе Беларусь не пабуджвае ўяўлення палітыкаў. Цяжка прытым за кагосьці адваяваць іншае жыццё. У Польшчы самой дапамогі было б недастаткова, калі б не было якраз тае энергіі супраціўлення.

(працяг праз тыдзень)

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

фота Мацея Халадоўскага

Агнешка Голанд *(нар. у 1948 г. у Варшаве) штудзіравала ў фільмавай школе ў Празе ў час Пражскай вясны. Выкладаў там у той час вядомы ва ўсім свеце пісьменнік-дысідэнт Мілан Кундэра. Сядзела ў чэшскай турме. Сваю фільмавую кар'еру пачала з супрацоўніцтва з Анджэем Вайдам і Кшыштафам Зануссі. У 1980 г. выехала з краіны і за мяжой заспела яе ваеннае становішча ў Польшчы. Засталася за мяжой. З таго часу ставіць фільмы амаль ва ўсім свеце. У лік яе найбольш вядомых твораў — «Niedzielne dzieci», «Zdjęcia próbne», «Gorączka», «Kobieta samotna» (гэтыя фільмы належаць да класічнай ужо плыні кіно маральнага неспакою), «Zabić księdza» (фільм пра ксяндза Ежы Папялушку), «Europa, Europa», «Olivier, Olivier», «Plac Waszyngtona», «Kopia mistrza». Належыць да эксклюзіўнага клуба польскіх людзей мастацтва, якім удалося ўвайсці ў эліту міжнароднага кінематографа.*

Дзе той дом?

Гэтак можа быць у горадзе і вёсцы. Усюды там, дзе жывуць людзі і дзе стаяць дамы. Шматлікія жыхары вёсак, але бывае гэта і ў горадзе, не дбаюць пра дошкі з нумарам свайго дома. Іх або зусім няма, або паіржавелыя ды вельмі бляклыя. Як трапіць сюды, напрыклад, хуткай дапамозе, новапрынятаму на працу лістаношы ці сваяку, які ўпершыню прыехаў адведаць сваіх родных?

Купіць гатовую дошку з адпаведным нумарам або самому напісаць яе — справа не такая цяжкая. Усё ў нядбайнасці, не інакш. Для прыкладу, у Гайнаўцы па самай доўгай у тры кіламетры вуліцы Ліпавай стаяць жылыя блокі. Тут справа нумароў дамоў апошнім часам адмыслова вырашана. На бакавых сценах намаляваны вялікімі лічбамі нумары блокаў. Але там-сям побач вуліцы стаяць вілы і асабнякі. Некаторыя з іх знаходзяцца воддаль ад вуліцы і за агароджай ды густа пасаджанымі кустамі або дэкаратыўнымі дрэвамі. Нумара на іх не згледзіш, асабліва ў пару прыцемкаў ды ноччу. Бывае, што не падыдзеш бліжэй дома, бо за плотам бегае сабака. У такім выпадку добра было б прымацаваць дошачку з нумарам на слупку брамы або на агароджы ля самога тратуара.

Можна прывесці шмат пазітыўных прыкладаў з нумарамі на дамах і на варотах, якія ўвечары і ноччу падсветлены. Зараз, зімой, маем больш свабоднага часу чымсьці ўлетку.

У Гайнаўскай гміне

У Гайнаўскай гміне пабудавалі шмат добрых і гладкіх дарог. Асфальт паклалі ад гарадской вуліцы Дольнай у Гайнаўцы ў Новае Беразова ды з Арэшкава ў Альшыну і далей у Лазіцы. Зараз улады Гайнаўскай гміны супольна з павятовымі плануюць пакласці асфальт на дарозе з Бельшчыны ў Дубіны.

Апрача дарог рэалізавалі і іншыя інвестыцыі, між іншым, адрамантавалі святліцу ў Махнатым і сёлета аддадуць у карыстанне святліцу ў Навасадах. Запланавалі і пабудаваць санітарную каналізацыю з Хітрай у Дубічы-Асочныя.

(ян)

Навінкі з Чаромхі

Чаромхаўскі бюджэт

20 снежня 2007 года адбылася чарговая сесія Рады Чаромхаўскай гміны, на якой радныя прынялі рашэнне аб бюджэце на 2008 год. І так сёлетні бюджэт складае суму 9 837 116 зл. на баку прыбыткаў ды 10 427 116 зл. на баку выдаткаў.

Дэфіцыт 590 000 зл. будзе пагашаны банкавым крэдытам. Важнейшыя інвестыцыі, якія адобрылі радныя, гэта:

— пабудова гміннага водаправода ў Зубачы, Бабраўку і Беразышчы (2 875 881 зл.),

— мадэрнізацыя дарогі Ставішчы — Полаўцы (831 225 зл.),

— мадэрнізацыя вуліцы Сасновай (1 264 070 зл.),

— мадэрнізацыя дарогі Кузава — Рэпчычы (700 129 зл.),

— мадэрнізацыя вулічнага асвятлення на энергазберагальнае (152 597 зл.),

— пабудова санітарнай каналізацыі на Сасновай, Падлесьнай, Спартовай, Польнай, Грунтовай, Галэмбяй і Круткай вуліцах Чаромхі.

(ус)

Турыстычны Беласток

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

14 студзеня г.г. у Беластоку адбылася першая частка навуковай канферэнцыі, прысвечанай турызму і адпачынку ў горадзе; другая частка адбылася дзень пазней у пушчанскім антуражы Гайнаўкі і Будаў. Сярод арганізатараў мерапрыемства былі беластоцкія турыстычныя суб'екты, мясцовая Вышэйшая менеджэрская школа; беластоцкая частка канферэнцыі адбылася ў гатэлі „Браніцкі", што побач нашай рэдакцыі.

На канферэнцыю былі запрошаны госці з навуковых устаноў Польшчы, Літвы і Беларусі. На вялікі жаль, прадстаўнік Беларусі ад Брэсцкага дзяржуніверсітэта не з'явіўся; я падслухаў, што ён не атрымаў дазволу ад сваёй навуковай вертыкалі. А вельмі шкада, бо даклад прафесара Андрэя Гарбацкага меў быць прысвечаны паломніцтву і турызму ў Брэсцка-Кобрынскай епархіі.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Канферэнцыю адкрыў Міхал Лісоўскі — рэктар Вышэйшай менеджэрскай школы ў Беластоку

Заміж гэтага крыху дадам ад сябе: Заходняе Палессе, дзе маецца менавіта згаданая епархія, з'яўляецца надта нявыгаднай для турызму тэрыторыяй, таму туды не надта часта заглядалі вонкавыя асобы, у іх ліку і тыя, што неслі новыя канфесійныя плыні. Таму Палессе захавала шмат з даўніны, нават з перыяду язычніцтва, астаючыся доўгі час своеасаблівым культурным скансэнам. І ў хрысціянскі перыяд нявыгадна туды было заглядаць вартавым канонаў, таму на Палессі паціху пранікаліся ўзаемна візантыйскія і лацінскія ўплывы. І крыху ад тае спадчыны асталося, нягледзячы на засцерагальную ад „опіуму для мас" дзейнасць стражаў „адзіна правільнай маралі" ў другой палове XIX стагоддзя. Пра прыродныя каштоўнасці найбольшага балотнага біяцэнозу Еўропы згадваць нават залішне. На жаль, больш дэталёва з турыстычным даследаваннем прыродных і культурна-канфесійных каштоўнасцей Брэстчыны не ўдалося пазнаёміцца...

Сакратар Гарадской управы Беластока Кшыштаф Карпесюк разважаў пра шырока асэнсаваную турыстычную базу горада, дзе вельмі важнае значэнне маюць камунікацыі са светам. Пра беластоцкі аэрадром таксама крыху было згадкі, але я тут гэтай тэмы кранаць не буду, бо яна, здаецца, актуальная *и ныне, и присно, и во веки вековъ*... Выступовец крыху панаракаў на еўрасаюзныя абмежаванні, якія памежжа з Беларуссю, а значыць і Беласточчыну, зводзяць да перыферыйных тэрыторый. Усё ж такі пачынаецца апрацоўка турыстычнага праекта „Гасцінны Беласток", які мае падняць горад у туррэйтынгу.

Падляшскае ваяводства штогод наведвае 1,6 мільёна турыстаў, з якіх звыш 60% наведвае гарады. Аднак жа ўдзельнікі дыскусіі заўважылі, што дамінантнай вонкавай прыметай Беласточчыны з'яўляецца перш за ўсё Белавежа, іншыя турнапрамкі мала заўважальныя. Іншыя прамоўцы прапанавалі ўзяць пад развагу пабудову быстраходнай чыгункі ў Варшаву заміж усё туманнага аэрадрома; на гэта спадар Карпесюк адказаў, што Кракаў і Познань рыхтуюцца да пабудовы ў сябе другіх аэрадромаў, абы пашырыць доступ інвестарам.

Пётр Голдын з Вышэйшай гуманітарна-эканамічнай школы ў Лодзі гаварыў пра выпуск турыстычных адзнак, якія маглі б прыцягнуць іх калекцыянераў. Асабліва многа такіх адзнак прапануюць шлёнскія мясцовасці; яны рознай ступені, з рознага металу, розных колераў і велічыні. Дакладчык згадаў пра адзнаку ксяндза Папялушкі, што родам ад Сухаволі; гэтай адзнакай, аднак, прыманьвае да сябе рэлігійных турыстаў не Беласточчына, але варшаўскі квартал Жалібаж...

Іаанна Снядэк з познаньскай Акадэміі фізкультуры звярнула ўвагу на прыцягненне да турыстычнай ідэі агулу насельніцтва. Прыцягненне турыстаў павінна быць сродкам прыцягнення іхніх грошай, але бывае так, што тыя турысты, хаця хочуць, не маюць на што сваіх грошай выдаць. Звярнула яна ўвагу, што частай хібай арганізацыі турызму з'яўляецца падробка чужых узораў, што прапанаванаму аб'екту адымае прыцягальнасць. Дадала яна яшчэ адну цікавінку: амаль усе ваяводскія цэнтры ў Польшчы маюць свае стратэгіі развіцця турызму, але каля паловы турстратэгій астаецца толькі на паперы.

Прафесар Васіль Чачуга расказаў пра прыродную сутнасць горада, які з'яўляецца штучнай экасістэмай. Паколькі большасць вясковага насельніцтва Беласточчыны перасялілася ўжо ў гарады, ды і з цяперашніх вяскоўцаў я не ўяўляю нікога, хто б у горадзе не бываў, варта тут пазнаёміць нашага чытача з тым аспектам горада, які малавядомы звычайнаму чалавеку, а пра які расказаў спадар Чачуга. Я тут прывяду адно кароткае рэзюме ягонага даклада.

У 1800 годзе ў гарадах пражывала 2,5% насельніцтва нашай планеты, у 1950 годзе гэты паказчык падняўся да 21%, а зараз ён недзе каля 55%. Паколькі ў гарадах зараз многа асфальту і бетону, якія назапашваюць цеплавую энергію, горад у наш час становіцца кліматычным фактарам. З бетону і асфальту хутчэй выпароўвае сырасць, таму ў горадзе больш сухое паветра. У горад завозяцца вялікія колькасці арганічнай матэрыі і мінеральных носьбітаў энергіі, у выніку чаго наступае забруджванне асяроддзя. У паветры, што ў цэнтры горада, вуглекіслага газу (CO_2) у чатыры разы больш, чым на акраінах, двухвокісу серы (SO_2) — у пяць разоў, двухвокісу азоту (NO_2) — у дваццаць разоў, пухлінагенных кампанентаў выхлапных газаў — у дваццаць пяць разоў. У сырое надвор'е серныя і азотавыя вокісы ўступаюць у рэакцыю з вадою, утвараючы ядавітыя кіслоты. У сухое надвор'е тыя вокісы падымаюцца да хмар і там злучаюцца з вадою, падаючы пазней кіслымі дажджамі.

У недастаткова праветрываных гарадах утвараюцца смогі. Найбольш вядомы з іх серны смог у Лондане. Але ёсць яшчэ і іншы небяспечны смог, азонны, які найбольш вядомы з Лос-Анжэлеса ў Каліфорніі. Ён паўстае, калі тэмпература паветра падымаецца за 25°C, калі ультрафіялетавыя прамяні разбіваюць двухвокіс азоту, вызваляючы атамны кісларод, які злучаецца з малекулярным кіслародам, утвараючы малекулы азону, якія ападаюць на лісце і знішчаюць фотасінтэтычны апарат раслін... У чалавека азон выклікае кан'юнктывіт (zapalenie spojówek) і катаракту.

У гарадах дамінуюць чужародныя расліны, якія ўводзяць разлад у нашы арганізмы. Звалкі адыходаў з'яўляюцца рассаднікамі мікробаў і хімікатаў, у тым і цяжкіх металаў. Мікробы ў такім асяроддзі падлягаюць мутацыям, спараджаючы шкодныя і ўстойлівыя супраць лекаў прышчэпкі... Кожны арганізм мае чатыры асноўныя рытмы: сутачны, месячны, гадавы і сонечны (у апошняга адзінаццацігадовы цыкл, прывязаны да гэтакай жа актыўнасці сонечнай кароны). Кругласутачнае гарадское асвятленне, вібрацыі і электрамагнітнае поле разбураюць, у першую чаргу, сутачны рытм чалавека...

Апошнія дакладчыкі больш гаварылі пра беластоцкія будні. Дамінік Салавей з беластоцкай Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі паведаміў, што зараз у Беластоку 19 кіламетраў веласіпедных дарожак і іх працягласць будзе расці.

Антоні Роман з мясцовай Вышэйшай менеджэрскай школы прадставіў праект трохдзённага наведвання Беластока, падрыхтаваны Падляшскай рэгіянальнай турыстычнай арганізацыяй. Дакладчык, паказваючы царкоўку Магдаліны, сказаў пра яе, што гэта *kościółek zawiadywany obecnie przez wyznawców prawosławia*. Праект прапануе патэнцыйным турыстам *suto zastawiony stół* у Музеі вёскі ды *niepowtarzalną Biesiadę Podlaską* ў Фальварку Надаўкі. Значыць, Беласток прапануе вонкавым турыстам *пир во весь мир*. Відаць, самі арганізатары турызму ў нашым ваяводскім цэнтры лічаць, што турыстычных каштоўнасцей Беластока *без водки не разберёшь*.

Пад знакам Марцінкевіча і Беласточчыны

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У гэтым годзе ў Беларускай алімпіядзе ўпершыню ўдзельнічалі ліцэісты з Беластока. Сардэчна прывітаў іх прафесар Аляксандр Баршчэўскі, які старшынюе Галоўнаму камітэту алімпіяды. Новых сяброў цёпла ўспрынялі таксама бельскія і гайнаўскія белліцэісты. У акруговых элімінацыях XIV выпуску Алімпіяды па беларускай мове, якая 17 студзеня праходзіла ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прынялі ўдзел пяцьдзесят вучняў. Традыцыйна самую вялікую колькасць удзельнікаў складалі гайнаўскія белліцэісты, якія масава прыступаюць да школьных алімпійскіх змаганняў і ў выніку найчасцей колькасна пераважаюць у чарговых этапах спаборніцтваў. Адбываецца гэта з часу, калі Галоўны камітэт Беларускай алімпіяды, апасаючыся яе ліквідацыі, заклікаў белліцэістаў да масавага ўдзелу ў спаборніцтвах па беларускай літаратуры і мове.

Першы раз у Алімпіядзе беларускай мовы прынялі ўдзел ліцэісты з Беластока

Адзначылі двухсотыя ўгодкі

Вядучай тэмай сёлетняй алімпіяды была творчасць Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, якога двухсотыя ўгодкі з дня нараджэння адзначаем у гэтым годзе. Вучні, рыхтуючыся да пісьмовых прац і вусных адказаў, паўторна дакладна прааналізавалі творчасць пісьменніка і яго біяграфію разлічваючы, што свае веды і ўмеласці скарыстаюць у час алімпіяды. Якраз першая з пісьмовых тэм тычылася жыцця і творчасці юбіляра. Сярод бельскіх і беластоцкіх ліцэістаў не спаткаў я нікога, хто выбраў іншую тэму. З гайнаўскімі белліцэістамі было інакш. Амаль усе пісалі на тэму „Чым для мяне з'яўляецца Беласточчына".

— Беласточчына з'яўляецца для мяне малой айчынай, дзе я нарадзілася і выхавалася, — лічыць Уршуля Філіповіч з Ласінкі.

— На Беласточчыне я магу адчуваць сябе свабодна і гаварыць з бацькамі пасвойму, на мове нашых продкаў, якая мала розніцца ад нашай беларускай літаратурнай мовы, — кажа Марта Сухадола з Ляўкова.

Пра сваю Беласточчыну пісала таксама Паўліна Бяляўская з Нараўкі. Бачыць яна патрэбу захавання роднай мовы, якой карыстаюцца ў Нараўчанскай гміне. Не забыла яна напісаць пра зычлівасць мясцовых людзей, якія незнаёмых вітаюць з усмешкай і дапамагаюць ім. Згаданыя дзяўчаты з Нараўчанскай і Нарваўскай гмін вучацца ў Гайнаўскім белліцэі.

Юстына Смольская з Ляўкова вучыцца ў Ліцэі н-р 3 у Беластоку. Пісала яна пра творчасць Марцінкевіча, а вусна расказвала пра творы Яна Баршчэўскага.

Вучні рассакрэцілі, што не заўважылі, каб нехта пісаў працу на тэму „Агульная характарыстыка літаратуры першай паловы XIX стагоддзя", бо апасаліся, каб не загубіцца ў аналізе ананімнай літаратуры. У час пісьмовых работ вучням трэба было выконваць практыкаванні па граматыцы і рабіць пераклады з беларускай мовы на польскую.

Моцна хваляваліся перад вуснымі адказамі

Вучні з вялікай трывогай чакалі вусных адказаў, у час якіх поспех у многім залежыць ад выцягнутых білетаў з пытаннямі. Калі пытанні аказаліся ліцэістам па душы, яны адыходзілі ад конкурсных камісій з радасцю. Адна з бельскіх дзяўчат радасна заявіла, што магла б перад камісіяй вельмі доўга расказваць пра творчасць Максіма Багдановіча. Іншая вучаніца, Наталля Дзмітрук з Бельскага белліцэя, радавалася, што магла гаварыць пра родны горад Бельск і бабуліны вёскі, дзе захоўваюцца беларуская мова і культура.

— Я расказвала пра сваю школу, Бельскі белліцэй. Частка вучняў, якія паступаюць у нашу школу, ведаюць, што яны беларусы і свядома вучацца роднай мове. Іншыя прыходзяць у нашу школу з-за высокага ўзроўню навучання, але ў час адукацыі частцы вучняў удаецца зразумець, хто яны па нацыянальнасці і таксама пачынаюць адчуваць сябе беларусамі, — гаворыць Юльянна Дораш. Марыя Астроверх расказвала пра жыццё беларусаў у Польшчы, звяртаючы ўвагу на большую свабоду, якую апошнім часам атрымала наша нацыянальная меншасць.

На тварах некаторых ліцэістаў паявілася незадавальненне ад выцягнутых імі білетаў з пытаннямі. Настаўнікі стараліся пацяшаць сваіх вучняў, што пасля ўсебаковай падрыхтоўкі яны павінны перайсці да чарговага этапу алімпіяды.

— Я якраз незадаволеная пытаннем, хаця я вучылася пра цэнтры беларускай нацыянальнай думкі на Захадзе. Расказала я пра Ларысу Геніюш і Наталлю Арсенневу, гаварыла пра беларускія цэнтры ў ЗША і Лондане, пра радыё „Свабода" і дзейнасць беларусаў у Празе. Аднак па іншых тэмах я проста была лепш падрыхтаванай, — заявіла Наталля Рудчык з Ліцэя н-р 3 у Беластоку і стала расказваць пра свае зацікаўленні. — Я пастаянна чытаю „Ніву", штодзённа слухаю Радыё „Рацыя" і сачу за сайтамі, якія змяшчаюць інфармацыю аб Беларусі. Часта жыву беларускімі справамі, а з сяброўкамі размаўляю па-беларуску нават на аўтобусных прыпынках. Мабыць, зацікаўленне беларускасцю засталося мне ад дзядулі, які працаваў журналістам у „Ніве".

Сяброўка Наталлі, Кася Кузьміч з Гарадка, якая вучыцца ў Ліцэі н-р 6 у Беластоку, а на заняткі беларускай мовы прыходзіць у Ліцэй н-р 3, таксама звяртае ўвагу на беларускую дзейнасць.

— Я расказвала пра Францішка Багушэвіча, якога творчасць якраз люблю. Быў ён адным са стваральнікаў беларускай літаратурнай мовы, за што яго вельмі цаню, — кажа Кася Кузьміч. — Мяне якраз цікавіць беларуская культура і традыцыя, а беларускай мове вучуся з падставовай школы і хачу вучыцца надалей, а ў будучыні хацела б дапамагаць беларусам з Беларусі.

Многа працавалі дзеля перамогі

Зараз, калі ў рэйтынгах сярэдніх школ аднымі з самых важных фактараў становяцца вынікі алімпіяд, падрыхтоўка да іх становіцца штораз больш усебаковай і стараннай.

— Мы працавалі з вучнямі, ахвотнымі прыняць удзел у алімпіядзе, ужо з верасня. Стараліся мы прааналізаваць увесь школьны матэрыял па беларускай літаратуры, пачынаючы з яе пачаткаў, ажно да сучаснасці. Займаліся мы таксама з матэрыялам па граматыцы і рабілі пераклады з беларускай мовы на польскую і наадварот. Канешне, звярталі мы самую вялікую ўвагу на творчасць Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, але нашы вучні рыхтаваліся таксама да пісання работ па іншых літаратурных тэмах і да адказаў на вольныя тэмы, — сказала настаўніца беларускай мовы Бельскага белліцэя Анна Бжазоўская. Настаўніца з Гайнаўкі Іаланта Грыгарук паінфармавала, што гайнаўскія педагогі наогул карацей працавалі з вучнямі перад алімпіядай. Прычынай гэтаму быў масавы ўдзел ліцэістаў у школьных адборах, да якіх прыступіла пад сто вучняў. Хаця гайнаўская моладзь магла карыстацца парадамі настаўнікаў ад пачатку школьнага года, то самая інтэнсіўная падрыхтоўка распачалася, калі вучні былі кваліфікаваны да акруговых элімінацый.

— Хаця мы рыхтаваліся да алімпіяды са сваёй настаўніцай у асноўным на занятках беларускай мовы, то вельмі многа часу працавалі дома, а пасля кансультаваліся з педагогам у справе апрацаваных намі тэм, — заявіла Наталля Рудчык з Беластока. З ліку сямі вучняў беластоцкіх ліцэяў (беларускай мове ўсе вучацца ў Ліцэі н-р 3), што прыступілі да школьных элімінацый, усе былі кваліфікаваныя да акруговага этапу алімпіяды.

Вынікі праверкі пісьмовых прац будуць вядомы толькі пасля надрукавання гэтага артыкула і таму спытаў я пра ўзровень сёлетніх вусных адказаў.

— У гэтым годзе ўзровень вусных адказаў перад камісіяй, у якой я працавала, быў даволі роўны. Не было вельмі бліскучых адказаў, але не было і вельмі слабых, а вялікая частка вучняў адказвала даволі салідна. Якраз больш лепшых адказаў атрымалася на вольныя тэмы, — заявіла член конкурснай камісіі, настаўніца беларускай мовы Валянціна Бабулевіч.

Разбой у Гайнаўцы

На другі дзень праваслаўных Каляд школьная моладзь пайшла з гвяздай па Гайнаўцы калядаваць. Калі каляднікі падаваліся да чарговага дому, падышлло да іх некалькі высакарослых хуліганаў, заглянулі ім у кішэні і забралі закалядаваныя грошы, якія яны мелі перадаць царкве. Прытым загадалі школьнікам маўчаць.

Жыхары Гайнаўкі ўзбударажаны такім дзікунствам. Хочацца, каб паліцыя неадкладна занялася гэтай справай. Мабыць, каляднікі распазналі б разбойнікаў на паліцыйных здымках або на падставе фотаробатаў. Да гэтай пары гайнаўская паліцыя з хуліганамі распраўлялася паспяхова і хочацца верыць, што і цяпер так будзе. Трэба нам памятаць, што калі сёння хуліганы пакрыўдзілі школьнікаў, заўтра могуць учыніць разбой на дарослым чалавеку.

Дзед ДАНІЛА

„Кудзьмень" у Вялікапольшчы

19 студзеня ў парафіі Гуўтовы, 30 кіламетраў ад Познані, зайграў беларускі „Кудзьмень". Фольк-гурт выступіў у зменшаным саставе, бо не ўсе ўдзельнікі змаглі атрымаць

у час візы па шэнгенскай працэдуры. Вернікі каталіцкай парафіі мелі шанц пачуць як гучыць аўтэнтычная беларуская дуда, а пасля параўнаць яе з вялікапольскай дудой, якую запрэзентавалі прадстаўнікі познаньскай капэлы.

Ксёндз касцёла ў Гуўтовах з нагоды канцэрта прыўкрасіў святыню двума беларускімі сцягамі. Нацыянальныя колеры ўпрыгожылі таксама алтар. Перад канцэртам адбылася малітва за Беларусь, вяртанне свабоды і дэмакратыі.

Віталь ВОРАНАЎ

Кулік для невідучых

2 лютага г.г. (у суботу) праўленне гайнаўскага павятовага гуртка Польскага саюза невідучых (ПСН) арганізуе кулік для членаў з Гайнаўскага павета ды з Бельска-Падляшскага. У праграме: кулік па ўскраіне Белавежскай пушчы, вогнішча, пры якім можна будзе падсмажыць кілбаскі, будзе таксама бігас, хлебабулачныя вырабы, гарбата і кава. Пасля пачастунку пачнуцца гульні пры вогнішчы пад гукі гармоніка (гарманіст будзе абавязкова).

За дэталёвай інфармацыяй просім звяртацца да старшыні гуртка ПСН Януша Пуха (тэл. 085 682 36 04) і намесніка старшыні Яна Целушэцкага (тэл. 085 685 62 19). Колькасць месц не абмяжоўваецца.

Запрашаем усіх ахвотных членаў ПСН і іх апекуноў.

(ян)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Калядны вечар у PG-7 (Беласток 16.01.2008)

Прыемна адчуваць, як конік мой бяжыць,
Як ззяе зорны снег вакол, і звон званчэй звініць.
Сяшаюцца ўсе павіншаваць,
І звон збірае ўсіх сядроў Каляды святкаваць...
(калядка)

Цяжка ўявіць нам калядны перыяд без сустрэч з сябрамі, роднымі, сваякамі. І мала якія іншыя песенькі, як калядкі, даюць столькі радасці і цяпла ў зімовы час. Праўда, каб адчуць іх прыгажосць, трэба салідна падрыхтавацца, адшукаць прызабытыя абрады, песні, і пажаданні... Як у Гімназіі н-р 7 у Беластоку, дзе гімназісты і іх настаўніца Альжбета Рудкоўская наладзілі „Калядны вечар". Мерапрыемства мела шырэйшы, чым толькі школьны, абсяг. Гаспадары запрасілі сваіх малодшых сяброў з „чацвёркі" і іх бацькоў. Прыйшлі таксама выпускнікі гімназіі (ужо ліцэісты), таксама з бацькамі.

Мерапрыемства пачалося з выступлення школьнага хору, які ў сваім рэпертуары мае таксама праваслаўныя калядкі (нядаўна выступалі ў Цэнтры праваслаўнай культуры). Далей, усе дзеянні ўзялі ў свае рукі бойкія гімназісты-гаспадары — цётка Міхаліна (Ганна Пякарская) і дзядзька Антось (Яраслаў Якацюк). Спачатку паказалі яны пастаноўку „Калядны вечар" у народным клімаце. Вядома, не абышлося без каляднікаў з казой і варажбамі на Новы год. Найбольш жыва і каларытна былі прадстаўлены шчадроўскія варожбы. Дзяўчаты, як нашы бабулі і прабабкі, гадалі пра будучыя замужжы. У іх варажбах і прадказаннях выяўляліся цікавыя гістарычныя асаблівасці. Вось, напрыклад, адна палова дзяўчат мела пайсці замуж за малайца, а другая — за ўдаўца... Сапраўды, нашы дзяды і прадзеды нярэдка жаніліся па два разы або больш. Такая практыка вынікала з жыццёвых абставін, проста многа маладых жанчын памірала ў час родаў.

Выступае „Батлейка" з „чацвёркі"

Цыганка (Ася Хмялеўская) варожыць настаўнікам. Першая справа дырэктар Уршуля Штабельская-Копа

— Адкуль такія матывы?

— Мы хацелі паказаць нешта новае і адначасова прызабытае, — кажа настаўніца Альжбета Рудкоўская, якая ўжо другі год працуе з гімназістамі. У гэтым годзе яе выхаванкі масава прыступілі да прадметнага конкурсу па беларускай мове. Пакуль шэсць з іх пераадолела першы этап.

— Дзякуем таксама спадарыні Аліне Ваўранюк, якая дапамагла нам у арганізацыі сустрэчы, — дадала настаўніца.

Госці з „чацвёркі", як заўсёды, паказаліся з найлепшага боку. Яны прадставілі спектакль „Батлейка" ды падарылі ўсім падборку беларускіх калядак. Дадаткова, ад бацькоўскага аб'яднання АББА, гімназісты і ліцэісты атрымалі ў падарунку кніжку Людмілы Рублеўскай „Мышка Пік-Пік".

Цікава адзначыць, што мерапрыемства ў такім шырокім маштабе адбылося ў „сямёрцы" ўпершыню. Навучанне беларускай мовы вядзецца тут ужо пяты год. Новая дырэктар гімназіі, Уршуля Штабельская-Копа, была выхавацелькай у першым польска-беларускім класе.

— Гэты клас я ўспамінаю з найлепшага боку, — сказала дырэктар. — На сваю нацыянальную адметнасць яны глядзелі з цікавасцю і сімпатыяй. Нашы калядныя сустрэчы ў класе мелі таксама польска-беларускі характар.

Пасля афіцыйнай часткі быў салодкі пачастунак і калядкі для бацькоў. Моладзь з гімназіі і ліцэя трымалася ўжо асобнай кампаніяй. Яны дамаўляліся між сабой ужо на менш афіцыйныя, пазашкольныя сустрэчы...

Зорка
Фота Ганны Кандрацюк

Альжбета Рудкоўская і школьны хор

Гімназісты з казой

Маладыя чытаюць жахалкі

Рэдакцыя сустрачанскай газеты „Крык” гутарыць са спадарыняй **Галінай БАНЬКОЎСКАЙ** — бібліятэкаркай у Семяноўцы.

— Ці ў Вашай бібліятэцы ёсць беларускія кніжкі і ці людзі іх чытаюць?

— Беларускія кніжкі чытае моладзь, калі ім загадвае пані ў школе. Тады яны шукаюць вершаў і іншых кніжак.

— Як Вы думаеце, ці моладзь мае свайго любімага пісьменніка?

— Я не ведаю. Моладзь чытае тое, што іх цікавіць.

— Ці ў Вашай бібліятэцы былі арганізаваныя сустрэчы з пісьменнікамі?

— У нас была сустрэча з Мірай Лукшай. Мы гаварылі пра яе творчасць і жыццё. Яна падарыла нам сваю кніжку.

— А ці многа ў Вас чытачоў?

У гэтым годзе 70, гэта нямнога, бо калісь іх было 140.

— Ці моладзь любіць заходзіць у бібліятэку?

— Вельмі часта... Яны тут глядзяць тэлебачанне.

— Скажыце яшчэ, што найчасцей чытаюць маладыя?

— Вядома, найчасцей шукаюць класных чытанняў, пытаюць пра жахалкі, дэтэктывы.

Фота Матвея Сэвастыяніка

— Ці вялікі ў Вас кнігазбор?

— Дзесьці, на вока, 6 тысяч.

— А колькі грошай у год Вы прызначаеце на куплю кніжак?

— Недзе тысячу злотых.

— Ці ладзілі Вы тут мастацкія выстаўкі?

— У гэтым годзе ў нас быў мастацкі пленэр. Тут малявалі мастакі з Расіі, Украіны, Польшчы. Пасля ім наладзілі ў бібліятэцы выстаўку.

— А забавы?

— Забавы арганізуем у Багаты вечар і 9 жніўня, на свята Панцеляймона.

— Колькі гадзін удзень працуе бібліятэка?

— Нармальна, восем гадзін.

— А Вы самі, якія любіце чытаць кніжкі?

— Найбольш люблю рускую класіку.

— Дзякую за размову.

Гутарыла Юстына ДЗЯДУЛЯ (*Крык*)

Супрацоўніцтва: **Оля МІРАНЮК і Эвеліна БІРЫЦКАЯ**

Вершы Віктара Шведа

Свежае паветра

— Мама, кажа доня Ганка,
Цёпла на дварэ, без ветру,
Выйду я на прагулянку,
Свежым уздыхнуць паветрам.

— Мне не верыцца чамусьці,
Што паветра цягне з хаты.
Хай жа яно цябе пусціць
Не пазней як а дзевятай.

Баюся, мама

— Прыехала цётка Юстына,
Як хочаш быць добрым сынком,
Ты сваю цётку павінен
Пацалаваць перад сном.

— Ды крыху мне страшнавата,—
Адказ даў маме Макар.—
Як цалаваў цётку тата
Удар атрымаў у твар.

Музыка з кайфам

Кайф гэта гіп-гоп:)

Тоўстыя, залатыя ланцугі, на пальцах не менш бліскучыя сыгнеты. Да гэтага яшчэ самыя дарагія машыны. Вось як НЕ выглядае гіп-гоп у Беларусі! Варта дадаць, што і Польшча таксама далёкая ад такога ўяўлення, але ў MTV гэта штодзённасць. Напэўна справа ў вялікіх грашах, якіх у беларускай музычнай фабрыцы яшчэ няма, але, здаецца, гэта не праблема — ідэйнасць гэта справа падставовая!

Са сваёй музычнай ды ідэйнай прапановай з'явіўся на сцэне ўжо пару гадоў таму назад. Пачаткова цяжка было даведацца хто гэта, бо і выступаў ён у масцы. Добра помню, калі ў падобны спосаб турбаваў слухачоў гурт, які ўсе называлі „ZET”, але яны гралі іншую музыку. Здаецца аднак, што супольнасць у адносінах да сваёй улады, маска здаваліся ўцёкамі ад ідэнтыфікацыі, але і былі своеасаблівасцю. Вядома, што калісьці кожны здыме сваю маску. Прыйшла таксама пара на Амбасадара Кроў. Хаця пасля яго першай прэзентацыі на фестывалі „Басовішча” ў 2005 годзе, калі Кроў выступаў разам са сваім польскім сябрам яшчэ на Вольнай сцэне, будучыня яго камуфляжу не была пэўнай. Кроў сачыў за гэтым, каб ніхто не здрадзіў яго тоеснасці і, здавалася, што гадамі будзе хаваць сябе. Тады таксама абяцаў паявіцца са сваёй гіп-гоп суполкай „Чырвоным па Белым”. Так пачалася вялікая папулярнасць Крові ды „ЧпБ”. Перад усім дзякуючы сацыяльна заангажаваным тэкстам, што ў пэўным сэнсе павінна прынамсі быць характэрнае цэламу жанру. Кроў не ўцякае ад цяжкіх спраў, не баіцца канфрантацыі з рэчаіснасцю, таму і змест яго творчасці вельмі жорсткі. У музычным плане таксама гэта творца, які з'яўляецца вельмі дбалым пра дробязі, дзякуючы чаму атрымліваецца якасны эфект. Добрым прыкладам гэтаму з'яўляецца супрацоўніцтва з польскімі музыкамі з калектыву „Masala Soundsystem” ды Dj Spox'ам. Мушу прызнаць, што зачаста не слухаю гіп-гопу ці рэпу, але часам карыстаюся альбомам „ЧпБ”, бо гэта сапраўды спелая творчасць, а сам Кроў вельмі цёплы чалавек, таму і прыемна пагаварыць, паслухаць ды пабываць разам. Маска застанецца толькі маскай.

i_basovka@o2.pl

Гумар

Дзве каровы вядуць з сабой гутарку. Адна кажа:

– Мууу...

Другая:

– Ммэээ...

– Ты, не мяняй тэмы!

* * *

Іван хваліцца ў школе:

– Я злавіў рыбу як мая рука!

Зося пытае:

– Калі яна такая запэцканая як твая рука, цікава хто яе возьме ў рот?!

Марыюш ФРАНКОЎСКІ (Акно)

Польска-беларуская крыжаванка № 4

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 52: Перац, вежа, экран, Ала, кніжка, ды, клан, ар, тварог, веды, рай, штат, я, ікра. Вада, спелы, ежа, квет, сцэнарый, кіно, шарж, Ака, грак, Ака, канарэйка.



Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Юстына Анішчук, Кацярына Капытка, Марта Адамюк** з Чыжоў, **Івона Баршчэўская, Данель Баршчэўскі** з Орлі, **Аня Хвашчэўская** з Гайнаўкі. **Віншуем!**

Няпроста працаваць на адным энтузіязме!

З Тацянай КАЗАК, старшынёй Культурна-асветнага таварыства ў Латвіі „Сьвітанак", гутарыць Ганна Кандрацюк.

— ***Вы родам з Брэстчыны?***

— У Латвію я прыехала ў 1986 годзе, якраз пасля Чарнобыльскай аварыі. Муж мяне сюды забраў. Тады я вучылася ў Чыгуначным інстытуце ў Гомелі. Мы вырашылі, што тут я прадоўжу вучобу. І я тут закончыла Палітэхніку, а пасля эканамічны напрамак. Зараз працую дызанейрам...

— ***Калі Вы сталі кіраўніком „Сьвітанка"?***

— Фактычна я ў „Сьвітанку" з 1992 года. Раней не было як дзейнічаць, бо ў нас нарадзіліся дзеці. Прычым пра „Сьвітанак" я даведалася ад свайго бацькі ў Беларусі, ён мне паказаў газету „Голас беларуса", якую тут спрабавалі аднавіць. Бацька дапытваўся чаму я не належу да беларускай суполкі. І так здарылася, што аднойчы я ехала ў адным цягніку са старшынёй Міколам Ярчаком (пасля ён з'ехаў у Беларусь і зараз працуе ў Брэсцкім тэхнічным інстытуце). Паколькі мы пазнаёміліся, я адразу прыйшла ў „Сьвітанак" і пачала займацца грамадскай справай. У 1999 годзе мяне абралі старшынёй. Нейкі час я працавала ў амбасадзе Беларусі. На працу запрасіў мяне пасол Валянцін Вялічка, які шмат нам дапамагаў. Пасля там адбыліся вялікія персанальныя і ідэалагічныя змены. З часам кантакты ў нас парваліся. Нам прапанавалі памяняць бел-чырвона-белы сцяг, сімволіку. Зразумела, што тут ніхто не памяняе сімволікі, такім чынам мы асталіся без падтрымкі Рэспублікі Беларусь.

— ***Ці зараз падтрымліваеце кантакты з амбасадай?***

— Я не магу сказаць, што ў нас няма ніякіх кантактаў. Мы пасылаем ім запрашэнні на нашы мерапрыемствы, дык дзіўна было б, каб яны прыйшлі да нас на 25 Сакавіка! Кантакт з амбасадай трымае школа, таму што там ідзе нейкая дапамога. Тыя стасункі выглядаюць па-рознаму.

— ***Мяне ашаламіла звестка, што патрыятычныя святы — гадавіну Слуцкага Збройнага Чыну ці Свята Волі — вы адзначаеце пры публіцы ў 600-700 чалавек. Хто прыходзіць на вашы мерапрыемствы?***

— Нам залежыць, каб дайсці з беларускім словам да як найбольшай колькасці людзей. Паколькі такія імпрэзы маюць культурна-асветны характар, яны карыстаюцца зацікаўленнем грамадства. Мы паказваем колькі агульнага ў нашай гісторыі з латышамі. Што ў такіх самых абставінах беларусы змагаліся за незалежнасць. Я думаю, што калі мерапрыемства на нармальным узроўні, людзі заўсёды прыйдуць.

Пры нагодзе мы робім апытанні сярод публікі, таму вядома хто прыходзіць на нашы мерапрыемствы. Беларусы складаюць 50 працэнтаў. Прытым 20-30 працэнтаў прыходзіць пастаянна на беларускія святы. Апошнія, гэта латышы і іншыя нацыянальнасці.

— ***Якія ў вас стасункі з Саюзам беларусаў Латвіі?***

— Ну, мы дзейнічаем сабе, а яны — сабе. У нас няма канфліктаў. Мы не забараняем сваім людзям хадзіць да іх на мерапрыемствы, з таго боку таксама няма насцярожанасці.

— ***Яны карыстаюцца падтрымкай РБ?***

— Фактычна, так яно ёсць.

— ***У чым найбольшыя праблемы?***

— Каб запрасіць некага з Беларусі, мы мусім мець гранты. Са спонсарамі ў нас таксама складаная справа, мала хто хоча мець клопаты з боку беларускай дзяржавы. Сапраўды, тым структурам, якія падтрымліваюць рэжым, лягчэй. А ў нас фактычна ўсё трымаецца на энтузіязме. Я не сказала б, што гэта проста!

— ***„Сьвітанак" — гэта ў асноўным Рыга?***

— Калі стваралася суполка, дык фактычна на ўсю Латвію былі аддзяленні ў Вентспілсе і Даўгаўпілсе. Потым там былі створаны свае суполкі. Наогул, дзейнасць беларусаў у Латвіі шырокая. Мы падтрымліваем стасункі з Вентспілскім таварыствам „Спадчына", яны прыязджалі да нас з канцэртам на 15-годдзе таварыства.

— ***Увесь час гаворым пра дзеячаў і суполкі, узніклыя на аснове беларусаў, якія прыехалі з Беларусі. Ці прысутныя ў арганізацыях аўтахтоны?***

— У нас ёсць прафесар фізікі, вельмі актыўная сябра „Сьвітанка", Наталля Цімаховіч. Яна вучылася ў беларускай гімназіі ў Індрыі яшчэ пры немцах. Праўда, такіх беларусаў няшмат, але яны ёсць. Я ведаю, што ў беларускай школе бацькі многіх дзетак паходзяць з тых раёнаў, дзе кампактна пражываюць беларусы.

— ***Якія найважнейшыя мэты „Сьвітанка"?***

— На першым плане адукацыйныя справы, асветніцка-культурныя праекты. Гэта школа і прамоцыя беларускага слова ў грамадстве. Калі справа не будзе працягвацца, мы не зможам захаваць беларускія карані.

— ***Назавіце, калі ласка, самых значных дзеячаў „Сьвітанка"?***

— Гэта Тамара Станкевіч, Мікола Ярчак, Вячка Целеш, Сяржук Кузняцоў... Наогул у таварыстве каля трох тысяч сяброў.

— ***Колькі вашых беларусаў мае латышскае грамадзянства?***

— Можа палова.

— ***Ці цяжка атрымаць грамадзянства?***

— Калі жывеш некалькі дзесяткаў гадоў, хочаш не хочаш і так навучышся латышскай мовы. Праблема датычыць старэйшага пакалення. Людзі, якія прыехалі сюды ў савецкі час, русіфікаваліся. Але іх дзеці ходзяць у латышскія школы і яны натуральна адкрытыя на латышскую мову, культуру.

— ***Мы сустракаемся ў будынку нацменаў, дзе „Сьвітанак" мае сваё памяшканне. Якія плюсы такога суседства?***

— Наогул 22 суполкі ўваходзяць. Тут ёсць агульныя залы для карыстання, маем канцэртную залу на 100 асоб і выставачную залу, дзе можам прэзентаваць мастацтва меншасцей. Мы арганізуем тут мерапрыемствы, калі ў нас няма грашовай падтрымкі. Наогул, калі ў нас былі нейкія праекты, мы звярталіся ў Рыжскую думу з просьбай даць нам у арэнду вялікую прэстыжную залу ў цэнтры горада, таму што людзі больш ахвотна там ішлі. Дума часта нас фінансавала.

— ***Менавіта, як выглядае справа фінансавання?***

— Гэта надта тонкае пытанне, таму што датацыя, якую назначае нам Міністэрства культуры, гэта 200 долараў у год. Адно што „Сьвітанку" ўдалося арандаваць за сімвалічныя грошы памяшканне (гэта прыблізна 20 долараў у месяц). Таму ўся наша дзейнасць трымаецца на энтузіязме, сяброўскіх узносах.

— ***Чаму ў вас такая мізэрная датацыя?***

— У нас справамі меншасцей займаецца Міністэрства інтэграцыі, але мы туды не патрапілі, бо мы палічылі сябе ўжо інтэгравамымі і звярнуліся, каб нас фінансавала Міністэрства культуры. Пасля паказалася, што на гэта няма сродкаў. Такім чынам мы згубілі вельмі вялікія грошы.

— ***Што лічыце сваім найбольшым поспехам?***

— Я ніколі не думала пра свае поспехі, бо мая дзейнасць гэта ахвярнасць і энтузіязм. Праўда, раней не было ў нас такіх масавых беларускіх мерапрыемстваў. Напэўна цешыць тое, што ўдалося нам запрасіць вашых „Прымакоў", гурт „Стары Ольса", што наведваюць нас пісьменнікі — Уладзімір Арлоў ці Сяргей Панізнік. Дарэчы, Сяргей Панізнік робіць вельмі многае для беларускага адраджэння. Цешыць, што адзначылі 125-годдзе Якуба Коласа і Янкі Купалы і што шмат хто з латышоў быў уражаны гэтым мерапрыемствам. Напэўна поспехам з'яўляецца наш ансамбль „Сьвітанак", дзе выступаюць прадстаўнікі ўсіх пакаленняў, ад 13 да 65 гадоў. І, вядома, стварэнне сайта www.svitanak.lv.

— ***Як сярод беларусаў Латвіі ўспрымаецца „Ніва"?***

— Дзякуй Богу што яна ёсць! Мы распаўсюджваем „Ніву" на ўсіх нашых вялікіх мерапрыемствах. У нас было нават такое апытанне: ці „Ніва" павінна быць агульнай газетай Еўрасаюза. Усе нашы рэспандэнты напісалі: так. „Ніву" ведаюць у школе, дзе карыстаюцца ёю ў якасці дапаможніка.

— ***Якія ў вас прыярытэты на 2008 год?***

— У гэтым годзе мы адзначаем сваё 20-годдзе існавання і юбілей БНР. Шлях да незалежнасці Беларусі цесна звязаны з беларусамі Латвіі і нам хацелася б годна адзначыць гэтую дату.

— ***Жадаем вам поспехаў і вытрымкі ў ваш нялёгкі і складаны час!***

Фота з архіва Тацяны Казак

Тацяна Казак

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

„Ніва" і „Часопіс" у „Сьвітанку"

Дырыжор і кампазітар Кастусь Кіслы

Сяргей ЧЫГРЫН

У адным са сваіх пісем беларускі праваслаўны дзеяч і выдавец Барыс Данілюк са ЗША напісаў і папрасіў, каб я ў якім-небудзь беларускім выданні згадаў пра праваслаўнага і культурна-грамадскага дзеяча беларускага замежжа, рэлігійнага музыкаведа і кампазітара, дырыжора царкоўных і свецкіх хароў Кастуся (Канстанціна) Кіслага. „Мне здаецца, — піша спадар Данілюк, — што варта было б успомніць Канстанціна Кіслага, які арганізаваў і кіраваў выдатным царкоўным хорам у слонімскім праваслаўным саборы ў канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя, ды падчас польскае чысткі „крэсаў" быў перакінуты ці не ў Беласток. Пры першых саветах, здаецца, а пры немцах напэўна, кіраваў вялікім і добрым беларускім хорам у Беластоку. У 1944 годзе ён выехаў у Нямеччыну, а пасля вайны апынуўся ў Бельгіі, дзе, калі памёр кампазітар Равенскі, кіраваў хорам беларускіх студэнтаў у Лювэне. У 1959 годзе Канстанцін Кіслы пераехаў у Амерыку, дзе стаў рэгентам хору ў царкве БАПЦ у Кліўлендзе, склаў некалькі зборнікаў царкоўных нотаў і кіраваў свецкім беларускім хорам. Памёр, здаецца, у Беластоку, куды яго паралізаванага забрала дачка. Паходзіў ён з-пад Галынкі, што на Слонімшчыне. Меў брата Аляксандра, які пры немцах быў слонімскім бургамістрам і яшчэ аднаго брата, імя якога я не ведаю. Гэты брат быў забіты Арміяй Краёвай у Лідзе ў 1942 годзе...".

Кастусь Кіслы з калектывам ансамбля „Васілёк". Пачатак 1960-х гадоў. Фота друкуецца ўпершыню

Сапраўды, пра жыццё і лёс братоў Кіслых можна напісаць цікавую кнігу. Але найбольш яркай асобай быў усё ж Кастусь Кіслы. Згадак пра яго надрукавана мала. Найбольш напісаў пра гэтага таленавітага чалавека Юрась Гарбінскі ў сваёй шыкоўнай працы „Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. Жыццярысы. Мартыралогія. Успаміны" (Мінск — Мюнхен 1999).

Месца нараджэння Кастуся Кіслага падаецца па-рознаму: адны даследчыкі пішуць, што ён нарадзіўся ў Лэнчыцах (Лянчыцах), іншыя — на Беласточчыне, а па другіх крыніцах — на Слонімшчыне, адкуль быў родам яго бацька. А нарадзіўся Кастусь Кіслы ў 1898 годзе, якраз сёлета ў яго юбілей — 110 гадоў з дня нараджэння. Да 1921 года хлопчык разам з бацькамі вандраваў па свеце. Бо ў 1914 годзе сям'я пакінула Бацькаўшчыну і выехала ў бежанства. Жылі спачатку ў Марыупалі. Там Кастусь пайшоў вучыцца ў настаўніцкую семінарыю, дзе і паказаў свае музычныя здольнасці і слых. А калі некаторых настаўнікаў мабілізавалі на фронт, то 20-гадовы юнак у семінарыі пачаў выкладаць спевы, а таксама ўзначаліў хор. Першы свой канцэрт малады дырыжор хору стварыў не толькі з рускіх, украінскіх песень, але ўключыў і дзве беларускія народныя песні. Там, у Марыупалі, ён разам са сваімі бацькамі наведваў Беларускі камітэт, дзе вельмі шмат даведаўся пра Беларусь, пра тыя падзеі, якія там тады адбываліся. І ўсё ж у Марыупалі заставацца доўга сям'я Кіслых не магла, бо ў Расіі пачалася грамадзянская вайна, якая выгнала іх сям'ю ажно ў Турцыю, дзе яны часова знайшлі прыстанішча недалёка ад Канстанцінопаля.

Кастусь Кіслы, Пётр Конюх і Алесь Карповіч, 1954 г.

У 1921 годзе Кіслыя вярнуліся дадому на Беларусь. Разам з сям'ёй Кастусь Кіслы прыехаў на радзіму бацькі ў Слонім, які ўжо быў пад Польшчаю ажно да верасня 1939 года. Тут у Слоніме наш зямляк уладкаваўся на працу ў Спаса-Праабражэнскі сабор, дзе арганізаваў царкоўны хор, а ў Слоніме пры Народным доме — свецкі агульны хор. Царкоўны хор Кіслага заўсёды запрашалі спяваць на святую літургію 20 траўня ў Жыровічы, бо жыровіцкі прыманастырскі хор быў слабейшы. Дарэчы, у Спаса-Праабражэнскі сабор у гады Другой сусветнай вайны трапіла бомба і трохі яго пашкодзіла. А пасля вайны ў 1960-х гадах мясцовыя камуністы яго поўнасцю знішчылі. І толькі ў 1994 годзе, дзякуючы руплівасці айца Віктара, сабор зноў у цэнтры Слоніма ўзнёсся да нябёс.

У 1932 годзе Кастусь Кіслы прыязджае ў Беласток. Пры саборы св. Мікалая ён арганізоўвае школьны царкоўны хор, а таксама стварае хор пры Таварыстве беларускай школы (ТБШ). Разам з тым ён прапагандуе беларускае слова, культуру, музыку. Яго калектывы выступаюць з беларускімі канцэртамі на Беласточчыне, а гэта не падабаецца савецкай уладзе, якая прыходзіць сюды ў верасні 1939 года. За Кастусём Кіслым пачынаюць сачыць органы дзяржаўнай бяспекі. У 1941 годзе яго арыштоўваюць і саджаюць часова за краты. Але тут пачынаецца вайна — Кастусь выходзіць на волю і зноў вяртаецца ў Беласток.

У гэты час у Беластоку кіпела беларускае жыццё. Хведар Ільяшэвіч, Масей Сяднёў і Уладзімір Тамашчык стварылі тут Беларускі камітэт (Масей Сяднёў у сваёй „Масеевай кнізе" (Мінск 1994) назаве гэты камітэт Беларускім аб'яднаннем у Беластоку). Хлопцы наладзілі выпуск газеты „Новая дарога". Да іх далучаецца сваёй культурна-асветнаю справай і Кастусь Кіслы. Ён аднавіў свой хор, актыўна выступае з канцэртамі. Разам з хорам паказвае сваё майстэрства і танцавальны калектыў, таму хутка Кіслы арганізоўвае цэлы ансамбль беларускай песні і танца, які выступае не толькі ў Беластоку, але і па ўсёй Беласточчыне.

У чэрвені 1944 года Кастусь Кіслы пакінуў Беласточчыну і выехаў у Германію, а праз некалькі гадоў пераехаў жыць у Бельгію. Жылося там нялёгка, ды і працавалася ў шахце яшчэ цяжэй. У 1953 годзе ў Лювэне памірае беларускі кампазітар і хормайстар Мікола Равенскі, які кіраваў тут студэнцкім ансамблем беларускай песні і танца. Для беларускай моладзі ў Бельгіі гэта была вялікая страта, а таксама праблема: хто зможа замяніць таленавітага Міколу Равенскага? І на дапамогу прыйшоў Кастусь Кіслы. «Пачынаць трэба было ад найгалаўнейшага для хору — ад дырыгента, — піша ў сваёй кнізе „Дванаццатка" (Нью Ёрк 2002) Янка Запруднік. — З гэтым, на шчасьце, справа выглядала не безнадзейна: із сп. Кіслым (Кастусь) мы ўжо працавалі кавалак часу; дырыгент ён дасьведчаны (кіраўнік беларускага хору ў Беластоку падчас нямецкай акупацыі), і галоўна, што зь Льежу ў Лювэн і візы ня трэба, і цягнікі спраўна ходзяць. Спадар Кіслы ахвотна згадзіўся прыяжджаць на суботы й нядзелі ў Лювэн, цяжка адпрацаваўшы тыдзень у вуглякапальні, каб адразу ж пачаць рэпэтыцыі. Зь ім прыяжджала й прыгожая спадарыня Крутуль (Ірэна) для дапамогі ў танцах і ў песьні „Калыханка"».

Яўген Смаршчок, Людміла Рагуля і Кастусь Кіслы, 1954. Фотаздымак друкуецца ўпершыню

Кастусь Кіслы вельмі шчыра і шмат працаваў з ансамблем, папулярызаваў беларускую песню ў Еўропе. Выступаў з канцэртамі ў Лондане, Кёльне, Бруселі, Боне, Парыжы. Янка Запруднік 21 красавіка 1954 года пісаў з Лювэна да Алеся Карповіча: „Мы падскочылі былі адзінаццатага гэтага месяца ў Парыж (у складзе: Кіслы і 9 харыстых — „Лятучая каманда") на міжнародны канцэрт, ладжаны Інтэрнацыянальнай Камбатанцкай Арганізацыяй народаў Сярэдняе Эўропы. Дзеля нястачы часу мусілі абмежавацца чатырмя песьнямі: „Партызанскі марш", „Полька Янка", „Паласа" й „Пагоня". Пайшло добра: у праграме былі адзіныя мы, што давалі вакальныя нумары" (Янка Запруднік, „Дванаццатка", Нью Ёрк 2002, с. 433).

З траўня 1956 года Кастусь Кіслы жыў у Кліўлендзе (ЗША). Тут таксама не стаяў убаку ад беларускіх спраў. Ён кіраваў хорам моладзі ў Кліўлендзе, іншымі свецкімі і царкоўнымі калектывамі. Пад яго кіраўніцтвам беларускі хор моладзі быў ператвораны ў жаночы ансамбль „Васілёк". Кастусь Кіслы напісаў дзесяткі твораў царкоўнага ўжытку, выкарыстоўваючы ў сваёй творчасці багатыя традыцыі беларускай царкоўнай музыкі. Ён умела кампанаваў царкоўную музыку, выдаў нават музычны зборнік „Вялікдзень".

На працягу некалькіх апошніх гадоў свайго жыцця наш зямляк моцна хварэў. У канцы 1979 года са ЗША яго забрала дачка і прывезла ў Беласток, дзе 8 студзеня 1980 года Кастуся Кіслага не стала. Яго пахавалі на праваслаўных могілках на Выгодзе ў Беластоку. Знайсці дачку Кастуся Кіслага ў Беластоку аўтару гэтых радкоў не ўдалося. Можа выпадкова трапіць мой артыкул спадарыні Кіслай і яна адгукнецца ды раскажа нам больш пра свайго таленавітага бацьку.

Па інфармацыі Барыса Данілюка, пляменнікі Кастуся Кіслага (дзеці Аляксандра Кіслага) жылі ў Аўстраліі. А ўнукі працавалі ў Новай Зеландыі. Такі лёс беларуса Кастуся Кіслага, яго братоў, дзяцей, пляменнікаў і ўнукаў.

Таварыства беларускай культуры ў Літве

Нашы людзі — пры вядомай,
Легендарнай іх цярплівасці —
Здольны ўсё стрываць, адолець —
Апрача несправядлівасці...
(Ніл Гілевіч)

Леакадзія МІЛАШ, Вільня

Час бяжыць няўмольна хутка. Здаецца, нядаўна абмяркоўвалі мы план працы ТБК на 2006-2007 гады, а ўжо надышоў час падвесці вынікі, абмеркаваць што атрымалася, у якім накірунку трэба далей працаваць. Канец снежня і пачатак студзеня ў таварыстве быў багаты на цікавыя сустрэчы. У снежні чальцы таварыства ўдзельнічалі ўва ўсіх перадачах тэлеканала Белсат, якія праходзілі ў Вільні, Новы год сустракалі мы разам з вядомым сямейным украінскім ансамблем „Світліця", а ў пачатку студзеня ў ТБК адбылася сустрэча з Зянонам Пазьняком і Юрыем Бандажэўскім.

12 студзеня ў ТБК адбыўся выбарчы сход і разам адзначылі мы Новы-Стары год. Старшыня ТБК Хведар Нюнька распавёў пра дзейнасць арганізацыі за апошнія два гады. За гэты перыяд таварыства выдала каля дзесяці кніг (Мар'яна Пецюкевіча „Мой дзёньнік: пра падарожжа ў Рым", Уладзіміра Пецюкевіча „Узьняўся белы птах", пяць кніг Зянона Пазьняка і іншыя). Адбылася прэзентацыя кніг У. Пецюкевіча „Узьняўся белы птах", М. Казлоўскага „Галасы разбуджаных птушак", В. Іпатавай „Ахвяры сьвяшчэннага дуба", У. Коласа „Лёс ліцэя", адбыліся сустрэчы з вядомымі беларускімі пісьменнікамі і дзеячамі культуры, палітыкамі, сярод якіх былі Уладзімір Арлоў, Лявон Баршчэўскі, Анатоль Астапенка, Вольга Іпатава, Алег Трусаў, Алесь Лозка. Таварыства арганізавала і правяло два пікеты ў абарону дэмакратыі ў Беларусі, а старшыня таварыства прымаў удзел у канферэнцыях па Беларусі, якія праходзілі ў Вільні, і ў навуковых канферэнцыях у Сойме Літвы.

За апошнія гады чальцы таварыства арганізавалі і правялі некалькі пазнавальных экскурсій па гістарычных мясцінах Беларусі і Літвы, наведалі Гудзевічы і сустрэліся з дырэктарам тамашняга музея Алесем Белакозам. На Мядзельшчыне сустрэліся з вядомым краязнаўцам Янкам Драўніцкім, на Шаркаўшчыне — з дырэктарам музея Язэпа Драздовіча Адай Райчонак, у Гродне нас чакаў Уладзімір Хільмановіч, з якім наведалі мы Зэльву, пабывалі на магіле Ларысы Геніюш, усклалі кветкі каля яе помніка. Ларыса Геніюш для таварыства з'яўляецца ўзорам служэння Беларусі.

Падзеяй мінулага года былі „Дні нацыянальнай беларускай і літоўскай культуры", на якія прыехалі беларусы аж з далёкай Аўстраліі, у якіх прымала ўдзел прэзідэнт Рады БНР Івонка Сурвіла. У кастрычніку адбылося адкрыццё мемарыяльных табліц у гонар Н. Арсенневай і М. Гарэцкага ў цэнтры Вільні. Такія вынікі працы цешаць членаў таварыства.

На жаль, былі і сумныя падзеі. У іншы свет адышлі чальцы таварыства: доктар Г. Астроўскі — вучань Віленскай беларускай гімназіі; паэт М. Паўлоўскі; прафесар філалогіі Г. Войцік-Луцкевіч — дачка Зоські Верас; Кастусь Шышэя — жаўнер эскадрона Барыса Рагулі.

Мінулы год у ТБК прайшоў пад знакам Янкі Купалы і Якуба Коласа. У Вільні з гэтай нагоды адбылося шмат мерапрыемстваў, праводзіліся экскурсіі „Шляхамі Якуба Колася ў Вільні". У выніку плённай працы старшыня ТБК Хведар Нюнька ўзнагароджаны быў дыпломам ТБШ з нагоды 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

На выбарчым сходзе прысутнічала каля пяцідзесяці чалавек. Прэзідэнта таварыства ацэнена станоўча, было прапанавана аставіць раду ТБК у ранейшым складзе, старшынём аднагалосна абраны Хведар Нюнька.

Пасля ўрачыстай часткі Таццяна Райнене прачытала на памяць паэму „Тарас на Парнасе". Гэта быў яе, доктара медыцыны, якая з навуковымі дакладамі аб'ехала ўвесь свет, артыстычны дэбют. Паэму вывучыла яна ў памяць мамы, якая заўсёды чытала перад сябрамі, апошні раз — на 80-годдзі Кастуся Шышэі, на якім былі і мы з Хведарам Нюнькам. Дэбютам Таццяны Райнене завяршыліся мерапрыемствы з нагоды 125-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа. Навагодні верш прачытала самая маленькая ўдзельніца ТБК Ксенія Мілаш, калядныя і прысвечаныя 90-м угодкам БНР песні выканаў Андрусь Старавойтаў, а пасля ўсе разам спявалі беларускія народныя песні. Святочна, па-навагодняму аформіла залу мастачка Хрысціна Балаховіч, багаты стол беларускіх страў падрыхтавала Ніна Брылеўская. З чаркай гарэлкі, за багатым сталом праводзілі мы Стары і сустрэлі Новы 2008 год.

Наперадзе шмат працы на карысць беларушчыны, па захаванні нашай мовы, культуры, гістарычнай памяці.

Жыве Беларусь!

Тое, што Беларусь перажывае зараз далёка не лепшыя часы, даказваць няма патрэбы нават таму, хто далёкі ад палітыкі і нюансаў эканамічнага жыцця. Можна, канешне, неяк патлумачыць усе наступы лукашэнкаўскай улады на сацыяльныя і эканамічныя правы беларускага народа, але адразу паўстае пытанне: а чаму ж гэты народ дазваляе да сябе так ставіцца? І напрошваецца адказ, што мабыць таму, што не адчувае сябе насельніцтва, якое жыве ў Беларусі, адзінай супольнасцю, з'яднанай адзінай гісторыяй, адзінай культурай, адзінай мовай, адзіным мінулым, сучасным і будучым. З таго і атрымліваецца, што як няма народа, дык ніхто і не паважае гэтае насельніцтва, пазбаўленае ўласных інтарэсаў і больш-менш агульных народных мараў.

Пераламаць такое становішча дагэтуль не ўдавалася нікому з беларускіх прагрэсіўных палітыкаў ці грамадскіх дзеячаў. Але гэта не значыць, што не будзе тых добраахвотнікаў, якія, хай сабе вельмі сціпла, аднак паспрабуюць навучыць свой народ паважаць уласную мову, гісторыю, культуру, ды і ў рэшце рэшт самога сябе. Відаць, менавіта з такіх меркаванняў узнік у Інтэрнэце сайт з вельмі ганарлівай назвай „Жыве Беларусь".

З першага пункту погляду партал, які месціцца па адрасе **http://jivebelarus.net**, выглядае даволі традыцыйна і сумнавата. Дзве няроўныя часткі падаюць выключна тэкставую інфармацыю. Ніякіх аздабленняў ці ўпрыгожанняў няма. Адзінае выключэнне прадстаўляе з сябе лагатып сайта, што месціцца ў левым вугле наверсе выяўлення.

Арыгінальнасць жа гэтага рэсурса крыецца ў пабудове яго зместу. Усе рубрыкі вядуць да шматлікіх артыкулаў па адпаведных тэмах і менавіта гэта робіць сайт інфармацыйна напоўненым. Чаго, дарэчы, дабіваюцца ягоныя распрацоўшчыкі. „Не ведаць беларускую гісторыю — гісторыю сваёй краіны, гісторыю сваіх продкаў — гэта дурная тэндэнцыя ў сучасным грамадстве, — з боллю ў сэрцы пішуць яны. — А без гэтых ведаў немагчыма лічыць сябе сапраўдным беларусам! Толькі памятаючы пра сваё старажытнае мінулае, можна ўпэўнена рушыць у будучыню! Шмат гадоў нам даводзілі, што мы не нацыя, а толькі нейкі прыдатак расейскага народу. Але гэта ў корані падман, хлусня ды й проста глупства! Вялікае Княства Літоўскае і яго багатая і слаўная гісторыя, пераканаўча сведчаць аб тым, што беларускі народ заўжды быў самастойным і самабытным, з унікальнай культурай і звычаямі! Матэрыялы сабраныя на гэтым сайце прызваны гэта падцвердзіць".

Матэрыялы сапраўды пацвярджаюць. Калі чытач захоча ў гэтым упэўніцца, то няхай зазірне ў рубрыкі, выйсці да якіх змешчаны ўверсе выяўлення. Гэта — „Гісторыя", „Мова", „Культура", „Наша спадчына" і „Цікавае". Тут кожны карыстальнік знойдзе вялікую колькасць тэкстаў розных аўтараў, пра якія ён наўрад ці змог бы даведацца дзе-небудзь у іншым месцы. Каб не быць галаслоўным прывяду прыклад з рубрыкі „Гісторыя", дзе месцяцца артыкулы пра беларускі нацыянальны і нацыяналістычны рух мінулага стагоддзя.

Адзіны недахоп сайта — таямнічасць ягоных натхняльнікаў і распрацоўшчыкаў. Яны, між іншым, прапануюць дасылаць ім свае электронныя лісты, але чамусьці не думаюць, што размаўляць з тымі, хто не хоча прадстаўляцца, не надта цікава.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

З паразай

Беларусы — рэдкія ўдзельнікі топ-турніраў па гульнёвых відах спорту. Таму выхад мужчынскай гандбольнай зборнай у фінальную частку розыгрышу чэмпіянату Еўропы, што праходзіць у Нарвегіі, быў успрыняты ўсімі з вялікім энтузіязмам. На такім першынстве нашы гулялі толькі раз — у далёкім 1994 годзе, калі занялі досыць прыстойнае 8-е месца. З тае пары ўцякло нямала вады і вось аксакал айчыннага гандбола Спартак Мірановіч зноў вывеў сваіх выхаванцаў у вышэйшы свет. На такіх чэмпіянатах слабых сапернікаў не бывае апрыёры, але папярэдняе лёсаванне было для беларусаў занадта бязлітасным, вызначыўшы ў адну групу з двума апошнімі чэмпіёнамі свету — Іспаніяй і Нямеччынай, а таксама моцнай Венгрыяй, якая была чацвёртай на афінскай алімпіядзе і ў якой беларусы ніколі не выйгравалі (4 „абаранкі" з 4!).

Жорсткая рэальнасць не дала спраўдзіцца надзеям на маленькае цуда — беларускі гандбол толькі пачынае адраджацца і маладой нацыянальнай дружыне пакуль бракуе досведу і зладжанасці. Але добра ўжо і тое, што хлопчыкамі для збівання нашы гандбалісты не сталі. Пацвярджаюць гэта і вынікі, хоць беларусам давялося тройчы пацярпець паразу — 26:34 ад немцаў, 31:36 ад іспанцаў і ўрэшце 26:31 ад венграў. Упартасці і майстэрства нашым хапала толькі на першы тайм, пасля чаго больш спрактыкаваныя сапернікі забіралі ініцыятыву ў свае рукі. З галоўных прычын няўдач назавем нетрываласць цэнтральнай лініі абароны, дзе малады (але досыць перспектыўны!) тандэм Максім Бабічаў — Аляксандр Цітоў пакуль не ў стане спраўляцца з асамі. Слабым звяном былі і галкіперы — Віталь Фешчанка і Андрэй Крайноў так і не здолелі па-сапраўднаму „зачапіцца" за мяч. Больш мог паказаць і паўсярэдні Сяргей Гарбок, які выступае ў бундэслізе. Момантамі вельмі ярка дзейнічалі іншыя нямецкія легіянеры — Іван Броўка і Андрэй Курчаў. А ў цэлым усе нашы згулялі ў сваю сілу. Для замежнікаў сапраўдным адкрыццём стаў распасоўшчык Барыс Пухоўскі, які смела браў на сябе ролю снайпера, закінуў у брамку немцаў ажно 10 мячоў і цягам турніру быў лепшым бамбардырам чэмпіянату. Шкада толькі, што беларусам давялося пакінуць Нарвегію ўжо пасля першага этапу. Чэмпіянат яшчэ раз выразна пацвердзіў, што без надзейнай абароны агульнага поспеху дасягнуць немагчыма. Не раз успаміналася і пра страты беларускай дружыны. Так лінейны Андрэй Клімавец, дагэтуль рэкардсмен нашай зборнай па колькасці згуляных матчаў і забітых галоў, ужо даўно выступае за Нямеччыну, у складзе якой стаў чэмпіёнам свету, а зараз імкнецца паўтарыць свой поспех. У стартавым матчы беларусаў браты Клімаўцы гулялі адзін супраць другога — унікальны выпадак у гісторыі сусветнага гандбола. З'ехаў і Сяргей Рутэнка, які ў дружыне Славеніі быў лепшым бамбардырам чэмпіянату свету 2006 года! Праўда, зараз ён заявіў, што збіраецца вярнуцца ў шыхты роднай зборнай. Для гэтага патрэбна вытрымаць усталяваны трохгадовы „карантын" — у складзе Беларусі ён можа з'явіцца толькі ў 2009 годзе. А значыць, шанцы прабіцца на алімпіяду 2012 года ў Лондане павялічваюцца. Пакуль жа на павестцы дня будзе стаяць кваліфікацыйны адбор на бліжэйшы чэмпіянат свету — выйсці туды нашым абсалютна рэальна.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Białystok, 13.01.2008 r.

Szanowny Pan Eugeniusz Czykwin
Redaktor Naczelny „Przeglądu Prawosławnego”

Szanowny Panie Redaktorze,

jestem czytelnikiem „Przeglądu Prawosławnego” od kilkunastu lat. Cenię pismo za rzetelne informowanie o prawosławiu w Polsce i na świecie, interesujące reportaże, kompetentnie napisane recenzje, przedstawianie sylwetek ludzi, którym drogie są ich wiara i przynależność narodowa. Redakcja zgromadziła grono dobrych dziennikarzy i współpracowników, wypracowała interesujący profil miesięcznika. Wielu piszących do „PP” znam osobiście, cenię i szanuję.

Ten pozytywny obraz pisma od kilku lat coraz bardziej zakłóca niskich lotów publicystyka polityczna uprawiana przez redaktora Michała Bołtryka. Warsztat dziennikarski i rzetelność przedstawiania opinii w jego rubrykach „Kilka zdań” oraz „Kronika Michała Bołtryka”, zdecydowanie odbiegają od wysokiego poziomu całego „Przeglądu Prawosławnego”.

Wielokrotnie ze smutkiem czytałem teksty red. Bołtryka szkalujące środowisko białoruskie w Polsce, pomawiające jego liderów, nawet mnie osobiście. Milczałem, ponieważ uważam, że w miesięczniku który nosi tytuł „Przegląd **Prawosławny”** takie teksty, i polemiki z nimi, nie powinny się ukazywać. Tym bardziej, że pismo w większości jest rozpowszechniane w świątyniach prawosławnych. Zgodzi się Pan, że miejsce, gdzie sprawowana jest Liturgia Święta, nie powinno być bezczeszczone przez politykierstwo, szerzenie półprawd, pomawianie ludzi, czy fałszywe przypisywanie im negatywnych cech czy intencji? Z całą pewnością nie jest to też miejsce na rynsztokowe odzywki typu „He, He!”, którymi raczy nas red. Bołtryk w ostatnim „PP”.

Podobnie jak wielu moich znajomych, czytelników „PP”, liczyłem na opamiętanie. Na próżno.

Żeby nie być gołosłownym, przypomnę niektóre nierzetelne fragmenty tekstu ze styczniowego numeru, zatytułowanego „Satelitą w Białoruś”, dotyczące powstałej niedawno telewizji Belsat TV. Robię to dlatego, że, jak to określił autor felietonu, jestem jednym z „twórców” tego kanału.

Pisząc po raz pierwszy o tak istotnym wydarzeniu medialnym, red. Bołtryk nie zadał sobie trudu, żeby dowiedzieć się u źródła co będzie nadawać Belsat TV. Po prostu przepisał tytuły i fragmenty artykułów na ten temat z innych pism. Ile takie metody mają wspólnego z rzetelnym dziennikarstwem — pozostawiam ocenie Pana Redaktora.

Dziennikarz, którego celem jest dotarcie do prawdy, zadzwoniłby do jednego z „twórców” Belsat TV, zajrzał na stronę internetową WWW.belsat.eu (w budowie) albo po prostu obejrzał kilka programów które są nadawane przez satelitę Astra (wkrótce Belsat TV będzie można również oglądać z satelity Syriusz — od Portugalii do Uralu). Gdyby to okazało się zbyt trudne, wystarczyłoby zajrzeć na stronę WWW.youtube, gdzie pod hasłem „Belsat” można obejrzeć fragmenty niemal wszystkim audycji proponowanych przez tę stację.

W ostateczności dociekliwy redaktor pojechałby do Hajnówki, gdzie u zaprzyjaźnionych gospodarzy, przy szklance herbaty, w sieci kablowej nadającej w niemal całym mieście, obejrzałby audycje Belsat TV. Od 8 stycznia sześć godzin emisji dziennie, docelowo szesnaście w czterech czterogodzinnych blokach programowych. Wkrótce na Podlasiu Belsat TV będzie można oglądać za pośrednictwem wszystkich sieci kablowych większych miast. „Twórcy” zwrócą się z tą samą prośbą do operatorów sieci kablowych we wszystkich miastach Białorusi.

Z tak przeprowadzonej kwerendy rzetelny dziennikarz z pewnością doszedłby do wniosku, że „seriale „Oficerowie” czy Ally McBeal” to wcale nie najciekawsze propozycje programowe tej stacji” (tyle przepisał red. Bołtryk z „Gazety Wyborczej”).

W ofercie programowej Belsat TV jest codzienny program informacyjny z Białorusi, programy publicystyczne, muzyczne, ekonomiczne, tok-szou, reportaże, filmy dokumentalne, widowiska artystyczne, relacje z koncertów, teledyski, programy satyryczne, teatr telewizji. W ich powstawanie zaangażowali się najlepsi dziennikarze telewizyjni z Białorusi, twórcy widowisk artystycznych i filmów dokumentalnych oraz kilkudziesięciu młodych ludzi, którzy uczą się tego trudnego rzemiosła. Wszystko jest przygotowywane przez Białorusinów dla Białorusinów, przede wszystkim w Białorusi, i w języku białoruskim. Biorąc pod uwagę kompletną rusyfikację państwowych środków masowego przekazu w Białorusi, szczególnie zaś telewizji, Belsat TV to jedyna telewizja nadająca w języku białoruskim.

Gdyby red. Bołtryk zadał sobie odrobinę trudu, dowiedziałby się, że filmy dokumentalne i fabularne, w innych wersjach językowych niż białoruska, są tam czytane nie przez lektora, tylko przez lektorów — z podziałem na partie męskie i kobiece. Taka jest praktyka w krajach byłego ZSRR, w odróżnieniu od „czytanki” jednego lektora, do której jesteśmy przyzwyczajeni przez Telewizję Polską.

Oferta programowa — przygotowywana w Białorusi i przez Białorusinów dla Białorusinów oraz język białoruski tej stacji — wyróżniają ją spośród wszystkich innych, jakie są dostępne w Białorusi.

Nieprawdą jest, jak pisze red. Bołtryk, że programy satelitarne stacji polskich i rosyjskich można w Białorusi oglądać bez cenzury. Przed dwoma laty operator sieci kablowej w Grodnie wycofał ze swojej oferty Program 1 Telewizji Polskiej, mimo że cieszył się on tam ogromną popularnością. Jedna decyzja spowodowała odcięcie od informacji 80 tysięcy widzów.

Inaczej „uzdatnia się” niewygodne dla białoruskich władz programy telewizji rosyjskich. Gdy w ramówce takiej stacji cenzor znajdzie podejrzany tytuł, wówczas w to miejsce białoruska stacja nadawcza „wkłada” własny program.

Widzom w Białorusi pozostaje lektura programu telewizyjnego drukowanego w gazetach.

Na koniec wątek osobisty. Nigdy nie byłem i nie jestem teraz „misjonarzem”, jak zjadliwie zechciał mnie nazwać red. Bołtryk. Chyba, że za taką działalność można uznać to, co od osiemnastu lat robię jako dziennikarz w Telewizji Polskiej.

Zdążyłem już być współautorem pierwszego w dziejach telewizji w naszym kraju programu cyklicznego w języku białoruskim, wraz z ks. Grzegorzem Misijukiem przygotowywałem pierwsze wydania magazynu prawosławnego „U źródeł wiary”, relacje z nabożeństw prawosławnych, festiwali muzyki cerkiewnej. Zrealizowałem około 50 reportaży i filmów dokumentalnych o tematyce białoruskiej i prawosławnej, za które otrzymałem 20 nagród na festiwalach filmowych w siedmiu krajach Europy i Ameryki.

Być może za działalność misyjną w zdrowym tego słowa znaczeniu można uznać cykl dokumentalny „Monastery prawosławne w Polsce”, który przygotowałem z red. „Przeglądu Prawosławnego” Anną Radziukiewicz, czy film dokumentalny „Prawosławie w Polsce”, który wraz z wystawą prezentującą dorobek kulturalny prawosławnych w Polsce objechał kilka krajów europejskich, dając dobre świadectwo naszej tutaj obecności.

Te i wiele innych propozycji programowych codziennie można obejrzeć na antenie Belsat TV, do czego zachęcam Pana Redaktora, zespół redakcyjny i wszystkich czytelników „Przeglądu Prawosławnego”. Dopiero wtedy można sobie wyrobić obiektywną opinię o kanale. Zapewniam, że każdą merytoryczną uwagę jego twórcy głęboko przyjmą do serca. Tego samego oczekuję od Pana Redaktora po lekturze tego tekstu.

Na podstawie odpowiednich zapisów „Ustawy prawo prasowe” bardzo proszę o wydrukowanie mojej polemiki w lutowym numerze „Przeglądu Prawosławnego”. Jestem przekonany, że Pan Redaktor — jednocześnie poseł kilku kadencji Sejmu RP — a więc osoba stanowiąca prawo w Polsce — potrafi podporządkować się jego zapisom.

Z życzeniami wszelkiej pomyślności w 2008 roku całej Redakcji i Jej Czytelnikom,

Jerzy Kalina

Do wiadomości (z prośbą o publikację):
1. Redaktor naczelny miesięcznika „Czasopis”.
2. Redaktor naczelny Tygodnika Białorusinów w Polsce „Niwa”.
3. Redaktor naczelny WWW.bialorus.pl
4. Redaktor naczelny WWW.cerkiew.pl

Апошнія лісты

Аўрора

Як хутка ўсё прамінае. Здаецца нядаўна я выходзіла з дому маёй мамы ў капліцу, дзе служылася набажэнства ў гонар велікамучаніка Панцеляймона. Жыў ён у III стагоддзі нашай эры, быў добрым лекарам. За тое, што быў хрысціянінам, верыў у Бога і бясплатна лячыў бедных людзей быў падвергнуты катаванням і прыняў пакутніцкую смерць. Яму адсеклі галаву.

У Семяноўцы, на могілках, пачынаючы з 1958 года, штогод 9 жніўня адпраўляецца ўрачыстае набажэнства ў гонар велікамучаніка Панцеляймона. У мінулым годзе ў багаслужбе ўдзельнічаў бацюшка з Пярэмышля. У пропаведзі ён расказаў не толькі пра жыццё велікамучаніка і лекара Панцеляймона, але таксама аб іншых здарэннях. Мне хацелася аб гэтым напісаць у „Ніву”, але ўсё неяк я адкладала ды адкладала і так прыйшоў канец года. Аднак цяпер я рашыла напісаць.

Аказалася, што той бацюшка — ураджэнец Залешанаў. Пасля вучобы лёс кінуў яго служыць у царкве ў Пярэмышлі. Гаварыў, што шмат разоў быў на царкоўных фэстах у Семяноўцы, калі яшчэ не быў бацюшкам, але ў капліцы не быў раней ні разу. Калі стаў служыць у Пярэмышлі, чытаў прыхадскую хроніку. З яе, між іншым, даведаўся, што ў час другой сусветнай вайны, калі адступалі немцы, разам з імі ехаў і бацюшка. Той бацюшка па прозвішчы Сангушка памёр 30 лістапада і пахавалі яго на могільніку ў Пярэмышлі. Аказалася, што ён — патомак старажытнага роду князёў Сангушкаў, у сярэдневякоўі ўладальнікаў Пярэмышля, стваральнікаў ды апекуноў мужчынскага манастыра.

Бацюшку Сангушку лёс пасля вучобы кінуў служыць Богу далёка на Украіне. Апошнія дні яго жыцця прайшлі ў родным горадзе. Ён пісаў вершы на рускай мове. Два гады да сваёй смерці ён у адным вершы напісаў такія словы: „Я отойду тогда, когда с деревьев опадут последние листы”. І гэтыя словы аказаліся праўдзівымі, бо 30 лістапада рэдка дзе мы ўбачым на дрэвах пачарнелае лістоўе.

Гэтая гісторыя зводзіцца да аднаго. Трэба, каб кожны чалавек задумаўся над сабою і ўсім акружаючым, над словамі, якія часам хтосьці скажа от так сабе, а яны акажуцца пасля некалькіх гадоў праўдаю. Сама я не ведаю ці не раз здзяйсняецца ўява сваёй удачы, няўдачы ў жыцці, а нават смерці, таму што чалавек верыць у гэта, а можа таму, што так Бог дае нашымі вуснамі сваё прароцтва.

Адгаданка

1. спецыяліст па археалогіі, 2. Васіль, савецкі маршал з нашых Козлікаў, 3. навейшыя фасоны ўбораў, 4. драўляны хамут для валоў, 5. сто араў.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 51 нумара

Дупло, Жлобін, брук, дойна, вяселле, вага, Чаромха, сват.

Рашэнне: **У кожнага дня свой вечар.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Анне Дэмянюк** з Бельска-Падляшскага і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: II kwartał 26 zł. do 5 marca 2008 r; III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r.; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.

Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

1. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy” w 2008 roku — 52. **Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Nakład: 2 000 egz.

Святло ў акне рыбакоўскай хаты

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

— Сярод ночы гляну — здаецца, гарыць святло ў вокнах дзядзькі Федзіка, — спаглядае праз шыбу на вуліцу ў Рыбаках Міхалоўскай гміны Марыя Хлябіч. Дзядзька Федар гэта хросны татулька яе мужа Аляксандра. Тут амаль усе сваякі. Аляксандраў дваюрадны брат гэта Уладзімір Казбярук, вядомы літаратурны мінскі крытык, Аляксандр кніжнік таксама, паліцы ў хаце Хлябічаў угінаюцца ад беларускіх выданняў. І цікава ім, якія новыя кнігі прыходзяць у Беласток, каб купіць іх ці хоць пачытаць, бо да нас цяпер з цяжкасцю даходзіць свежая беларуская кніга. А наконт сваяцтваў, дык спяшае Аляксандр Хлябіч прыгадаць мне, што ягоную маму хрысціла мая прабабуля Аўдося Мядзведзь, у дзявоцтве Гавеньчык. І хоць не сваякі, ды блізкія сябры, і ў Цісоўку, куды замуж пайшла Марыся, дачка Аўдосі і Міхася, вазілі з Рыбакоў авечак пасвіць, на сухія груды, бо тут над Нарвай гразка было.

Вось азірніся — за сталом у хаце Хлябічаў, што паміж домам Ніны Хлябіч і родным падворкам Віктара Буры, сядзіць жменя людзей. І амаль усе сваякі, калі б пакапацца ў радаслоўных — усе тут пушчанска-прынарваўскія. Хто зайшоў у гэты паслясвяточны падвячорак, хто ўжо выйшаў. Цяпер вось сядзяць Янак і Зінка.

— А мы ўжо і чакалі, што зараз хтось зойдзе, — смяецца гаспадыня. — Мы так усе адзін да аднаго ходзім на каву, пагаварыць, бо чаго ж сядзець у хаце. Глянулі на цябе як ты ішла па вуліцы, размаўляла з Ядзяй, глядзела аб'явы. Думалі, ці хто можа з гміны... Як ты падыходзіла да хаты Ніны „Канцавое", да дому дзядзькі Федара...

— Мне неяк крыху дзіўна стала... Я ж з ім апошняе інтэрв'ю ў яго жыцці ўзяла. А пісаў ён да канца свае вершы? Засталіся нейкія ягоныя творы? Ці радня не распарадзілася са спадчынай, як са зборамі Вацікa Асіповіча?

— Не ведаю, ці ўсё засталося, — адказве з сумам Марыся. — У мяне ёсць крыху ягоных рукапісаў. Сын сюды заглядае, ды нейкі такі дзіўны — прыедзе, не азвецца да людзей, не прывітаецца, хіба што яго сам зачэпіш і станеш распытваць, — тады толькі адбуркне. Зусім іншы чалавек, чым бацька... Дзядзька Федзя ўстане, бывала, ноччу чытае, піша... У ноч да свае смерці, перад тым, як выйшаў на вуліцу, таксама не спаў, мабыць, пісаў. Святло гарэла, свяціла мне сюды. Цяпер я пішу. Можа, дзядзька Федзя перадаў мне гэта...

— Паэтычная, літаратурная Міхалоўская гміна, а асабліва гэты прынарваўскі закутак. У Бандарах нарадзіўся Алесь Барскі, другі Аляксандр Баршчэўскі таксама пісаў, яшчэ і Васіль Баршчэўскі. Нядаўна ў Ціванюках памёр Аркадзік Леўшук. А вось у Юшкавым Грудзе пісала Люба Саковіч. Не можа быць парожняга месца. Цяпер мо ваша пара брацца за пяро?

Марыю Хлябіч, непаседлівую арганізатарку сустрэч выхадцаў вёсак, што леглі на дне Семяноўскага вадасховішча, сустрэла я першы раз на спатканні пад новаўзведзеным крыжам на лучанскім беразе. Неўзабаве пасля таго ля адноўленага крыжа ўрачыста спаткаліся жыхары Рудні. Збіраюцца тут ужо штогод. Для жменькі шчырых гуртавальнікаў, а асабліва для Марыі Хлябіч, гэта шмат клопату, а нават і коштаў. А і вершы свае чытала, навеяныя ўспамінамі, турботай, сардэчныя.

Аляксандр і Марыя Хлябічы

— Ніхто не спадзяваўся. Дык кажуць: о, чытае вершы Федара. Праўда, маю ў сябе творы і ягоныя, і хроснай маці маёй мамы Кацярыны Янушка з Рудні (яе верш „За мір" надрукаваны ў „Ніве" 30.03.1980 г.). Збіраю харошыя вершы, беларускія песні. Не ведаю, як гэта пачалося. У адзін год паехалі мы на „Сяброўскую бяседу" ў Гарадок. Можна было прыслаць верш пра мерапрыемства. Кажу Ніне Буры: глянь, пішацца мне верш. Прыйшоў Олек Кардаш. Кажу яму: „Не перашкаджай: мне пішацца верш". І напісала я той верш, за які прысудзілі мне першую ўзнагароду сярод 11 вершаў. Дома пачала я пісаць далей. Напісала два вершы пра Рудню. Ішлі былі ў адведкі — пакуль пачалі мы пячы пірог, я вершык напісала. І так то пра тое, то пра тое. Цяпер пачала пісаць верш пра тату. Цяпер мой тата ляжыць хворы пасля інсульту. Толькі ўздумаю, у вочы слёзы набягаюць — не дам рады, кідаю, не магу запісаць. Ах, як мне крыўдна было тады, што некаторыя сказалі, што я Федзікавы вершыкі чытала пры помніку ў Рудні! Я тады вершаў не чытала, ды пасля, калі спаткаліся мы на абедзе ў Ромка Ляткоўскага, дык я свае вершы там прачытала. Многія прасілі: Марыся, прышлі нам тыя вершы, або цяпер адпішы. Я некаторым адразу іх перапісала... Федзік Хлябіч шмат пісаў быў пра нашае. Пра старонку, пра „озера". Пра Рудню, праўда, не напісаў. А я і свой дзённік пішу. Нікому не паказваю. Памру — тады хай пачытаюць. А пра Рудню, вось — „Мае ўспаміны", „Рудня — вёсачка мая"... *Рудня гэта вёска, як бы дзве ў адной — Луплянка дзяліла іх як ручайком. У рэчцы мы купаліся летняю парой, на каньках каталіся кожнаю зімой. Мост тут дзеравяны праз рэчку прабягаў, дарогу ў вербах на грудок прадаўжаў. У вербах вясною спявалі салаўі, па вадзе на возеры качкі плывалі. За грэбляю, з мостам — рудніцкі грудок. Не аднаго кавалера цягнула ў той бок. Дзяўчыны харошы і добры тут жылі, таму захвацілі грудок прымакі. Воду ў рэчцы стрымаў вадзяны млын, збожа ў ім малолі на хлеб і на блін. Закаханы пары на мост прыбылі, любоў вызнавалі, потым лодкаю плылі. Мужчыны ў вёсцы займаліся рамяством, таксама жанчыны не ўступілі ні ў чом. Былі ў Рудні сапожнікі, печнікі, краўцы, мельнікі і фатограф, нават пчаляры. Дахоўку рабілі, каб будынкі крыць, бабы ткалі, пралі, бо трэба было жыць. Вёска невяліка, а як багатая: была тут гміна, і злеўня малака, склеп тут званы „лаўкай" багаты ў тавар (на пачатку вёскі ён усіх прымаў). Нават бібліятэка ў Рудні ўжо была, каб культура ў вёсцы не загінула. Свае музыканты забавы рабілі, каб дзяўчаты і хлопцы да чужых не хадзілі. У Рудні, як у горадзе, вуліцы былі, мы па іх хадзілі адны да другіх: Царавы, Цясноўскі, Гурэцкі, Анхімы — усе паміж сабою згодна тут жылі. Разам жыта жалі, вязалі ў снапы, на веселя прасілі, а потым у кумы. Было нам у Рудні весела жыць. Таму мы павінны яе не забыць. (18 лютага 2007 г.)*

Паказвае сшытак Марыся Хлябіч. Тут прыгожым почыркам выведзены тыя вершы — і пра Рудню, і пра Гарадок, і пра месяц ліпень, і пра тое, як да Данкі ішлі тады ў адведкі... І той першы верш пра „Сяброўскую бяседу". Пасля: „Калі чароўны гэты лес, я да яго вярнуся. А як добры гэты верш, дык я распішуся!"

— Прыйдзе штосьці такое ў галаву... І я ўставала і запісвала, як дзядзька Федзік. Нават і начамі, пакуль засну, думаю, думаю... Вось пісала была я пра беларускія калектывы. Кажу Элі і Касі Бурам: ну, ніяк штосьці мне не атрымліваецца гэта страфа. А вярнулася дахаты — і напісалаа. Заходжу да іх, пытаюся: „Добра, Эля, я напісала?" — „Добра!" Верш нахлыне ад чагосьці. Вось у мамы я пабачыла многа льняных настолак. І напісалася мне. І пішацца. Пад святлом з акна дзядзькі Федара.

27.01 — 02.02

(22.03. — 20.04.) Зноў выцягнеш з цяжкага становішча кагосьці, хто трапляе туды па сваім жаданні. Вельмі ўзрастае твая папулярнасць пад каралеўскім Сонцам. Можаш рвануцца нават на рэчы немагчымыя, і справішся з імі па-канцэртнаму.

(21.04. — 21.05.) Прадбачваюцца заручыны, шлюб ці павелічэнне сям'і. Засмакуеш у падарожжах, асабліва ў нязнаныя месцы. Найлепшыя прапановы трапяць проста ў твае рукі. Больш чым рамантычныя жэсты і шалёныя прыгоды будзеш цаніць узаемную падтрымку, шчырасць, вернасць.

(22.05. — 22.06.) Прыцягваюць цябе адны прыемнасці і жарсці. Грошы дадуць выгоду і пачуццё панавання над сваім жыццём. Калі не спраўляўся ты з дамінацыяй партнёра, будзеш мець палёгку. Маеш шанц скласці фундамент пад сваю сям'ю ці дом.

(23.06. — 23.07.) Значных змен патрабуе ад цябе пачуццёвае жыццё і кантакты з людзьмі. Мусіш перадумаць найважнейшае і вырашыць, таму што будзе цяжкая псіхічная напруга. Твой дом — месца прыемных сустрэч. Спрабуй экзатычнага масажу.

(24.07. — 23.08.) Вельмі добра ў пары, а ў самотных — каханне, якое цяпер развінецца, расквітнее. Можаш каханую асобу запрасіць у незабыўнае падарожжа. Сарганізуй сустрэчу сяброў з дзяцінства. Не аб'ядайся, лепш высыпайся, кінь курэнне.

(24.08. — 23.09.) Будзеш адчуваць сябе, як у запаволеным фільме. Больш высілку забярэ табе нават тое, што робіш машынальна. Адпачывай дома, сардэчныя сустрэчы з роднымі зарадзяць твой жыццёвы акумулятар.

(24.09. — 23.10.) Чым больш патрабуеш ад сябе, тым лепшыя вынікі; твой козыр цяпер — дысцыпліна і ўпартасць. Дома перамены і далёкія планы — ды ўсё добра, дбаюць зоркі аб ваш дабрабыт і поспехі.

(24.10. — 22.11.) Цяжка ўсе справы ахапіць, таму старайся ўсё высвятляць адразу. А будзеш нервовы, злосны. Перад табой новыя магчымасці, можаш даць свайму жыццю новую якасць. У пачуццях шалёныя эмоцыі. У прафесійным плане старайся з усімі жыць у згодзе.

(23.11. — 22.12.) Маеш нагоду разважліва запланаваць будучыню. Дойдзеш да паразумення з атачэннем, партнёр пераканае цябе ў лаяльнасці. Маеш добрую руку да інтарэсаў, зможаш забяспечыцца на будучыню. Задбай аб свае шчытавідку і ныркі.

(23.12. — 20.01.) Важныя здарэнні. Зменіцца свет вакол цябе, але і ты сам. Уваходзіш на сцежку без вяртання. Найбольш змен — у народжаных каля 31.12. Будзь асцярожны, не бойся адмовіць чаго-небудзь. На працы маюць значэнне кантакты з замежжам і падарожжы. Трымайся за кішэню!

(21.01. — 19.02.) Не спадзявайся спакойнай размовы з партнёрам. Могуць паявіцца запоры ў кампанейскім і прафесійным плане; каб пераскочыць іх, ты нянадта падрыхтаваны. Можа штосьці здрыганецца ў адносінах з асобай, якая дала ўжо табе чорную поліўку.

(20.02. — 21.03.) Ва ўсім, што робіш, старайся захаваць раўнавагу. Не парывайся на зацяжкія справы. Еж і спі здорава. У пачуццях няма асаблівых эксцэсаў, найлепш — з асобай, з якой працуеце разам ці вядзеце фірму.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960